

ЯКІ БІЗНЕС АДКРЫЦЬ НА ВЁСЦЫ

ЧЫМ ЗАЙМАЕЦЦА БЕЛАРУСКІ ЧЫРВОНЫ КРЫЖ




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 СНЕЖНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 236 (28852)


9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Тамара КРАСОЎСКАЯ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях:**

*«Парламентарыі прапануюць павысіць статус службы занятасці, зрабіць яе самастойнай структурай. Дзякуючы гэтаму яна зможа больш эфектыўна выконваць задачы, ускладзеныя на яе законам аб занятасці, Дзяржаўнай праграмай аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці на 2016—2020 гады, Дэкрэтам № 1. Акрамя таго, службе неабходна вярнуць шэраг кантрольных паўнамоцтваў. Напрыклад, раней яе прадстаўнікі выязджалі на прадпрыемствы, правяралі, ці запоўненая ўся штатная колькасць, ці правільна пададзеныя звесткі аб наяўнасці рабочых месцаў. Дэпутаты вывучаюць сітуацыю ў рэгіёнах і на гэтай падставе ўносяць прапановы аб паляпшэнні заканадаўства».*

# ДАРОГУ АДОЛЕЕ ТОЙ, ХТО ІДЗЕ

Прэзідэнт Беларусі прапанаваў канкрэтныя захады па вырашэнні найбольш вострых праблем ЕАЭС

**Учора ў Санкт-Пецярбургу адбылося пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, у якім узяў удзел Прэзідэнт Беларусі. Пасяджэнне пачалося значна пазней запланаванага часу. Меркавалася, што Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін паводле пратакола спачатку павітае кіраўнікоў дэлегацый, затым адразу адбудзецца цырымонія фатаграфавання, і яны накіруюцца на перагаворы. Аднак пасля сустрэчы з расійскім прэзідэнтам прайшла незапланаваная сустрэча кіраўнікоў дзяржаў за зачыненымі дзвярыма.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

# ЦУДОЎНЫ ЧАС

У Мінску ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» дадзены старт рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Цуды на Калядах». Мерапрыемствы будуць праходзіць у перыяд навагодніх і калядных свят да 9 студзеня 2019 года і папоўняць скарбонку добрых спраў усебеларускага праекта «Нашы дзеці». Па традыцыі валанцёры руху БРСМ «Добрае Сэрца» і цімураўцы БРПА ва ўсіх рэгіёнах краіны правядуць конкурсы, святочныя праграмы, арганізуюць адрасныя віншаванні для дзяцей, якія асабліва маюць у гэтым патрэбу, збяруць для іх падарункі.



Фота БелТА.

## КОРАТКА

- **Беларусь прапануе распрацаваць усеабдымную і доўгатэрміновую стратэгію сістэмы ААН для краін з сярэднім узроўнем даходу.**
- Беларуская федэрацыя біятлона абвясціла конкурс на самы лепшы слоган да адкрытага чэмпіянату Еўропы па біятлоне 2019 года.
- **Рэалізацыя праекта «Рэканструкцыя ампульнай вытворчасці» завяршылася на ААТ «Барысаўскі завод медыцынскіх прэпаратаў».**



- Урад Расійскай Федэрацыі ўхваліў ратыфікацыю пагаднення з Беларуссю аб уездзе замежнікаў на спартыўныя мерапрыемствы.

ISSN 1990 - 763X

Падпіска-2019

# «УДАЛЫ ШОПІНГ СА «ЗВЯЗДОЙ»: ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

*Ой «Звязда», мая «Звязда»,*
*Сто гадоў харошая!*
*На цябе, мая «Звязда»,*
*Не шкадую грошай я!*

Гэтыя радкі неяк раз па тэлефоне «выдала» адна з вельмі даўніх падпісчыц і, згадзіцеся, мела рацыю, бо, апроч задавальнення пяць разоў на тыдзень атрымліваць газету і чытаць штосьці патрэбнае ды цікавае (прычым па-беларуску!), са «Звяздой» яшчэ можна і выйграць! Што канкрэтна? А на гэты раз — што пажадаеце (альбо — што вам трэба...).

Такую вось цудоўную магчымасць даюць уладальнікам падарункавыя сертыфікаты ўнівермага «Беларусь» на сто і трыста рублёў.

Што зрабіць для таго, каб іх выйграць? Нічога асаблівага. Як «спявалі» ў коле сябровак іншыя нашы чытачкі:

*«Пачакайце вы, гулёны,*
*Я на вуліцу пайду,*
*Там сустрэну паштальёна —*
*Падпішуся на «Звязду»...*

Пасля чаго застанецца толькі запоўніць картку ўдзельніка рэкламнай гульні «Удалы шопінг са «Звяздой» (падрабязныя правілы змешчаны ў нумары за 6 снежня) і да 8 студзеня ўжо новага года (можна — разам з лістамі-віншаваннямі) дасланыя ў рэдакцыю, для таго, каб потым...

Розыгрыш прызоў адбудзецца 9 студзеня, падчас калядных свят, і некаму ў ім, вядома ж, пашанцуе. Цалкам магчыма — вам.

Картку ўдзельніка розыгрышу шукайце на першай старонцы «Тэлетыдня».



# ДАРОГУ АДОЛЕЕ ТОЙ, ХТО ІДЗЕ

## Здабыць карысць

«Мы трошкі пазней пачалі наша пасяджэнне, — сказаў пазней Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. — Мы ўсе разам амаль паўгадзіны слухалі інфармацыю Прэзідэнта Расіі аб апошніх падзеях (перагаворах у рамках «дваццаткі» і гэтак далей) і канстатавалі, што свет усё больш і больш вар'яцее ў плане эканомікі, гандлю».

На думку кіраўніка беларускай дзяржавы, для ЕАЭС гэта вялікі шанец аб'ядначца, згуртавацца і надаць яшчэ большую дынаміку развіццю супрацоўніцтва. «Давайце гэта зробім. Гэта ж залежыць ад нас, што сядзяць тут, за гэтым сталом. Беларусь да гэтага гатова», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета назваў адыходзячы год неадназначным. «Сёння мы падводзім вынікі агульнай работы ў фармаце саюза за гэты год і вызначаем арыенціры ўзаемадзеяння на наступны. Што датычыцца перыяду, які завяршаецца, то ён з'яўляецца даволі неадназначным як з палітычнага, так і з эканамічнага пункту гледжання», — сказаў ён.

Сярод пазітыўных дасягненняў Прэзідэнт адзначыў уступленне ў сілу дагавора аб Мытным кодэксе ЕАЭС, надзяленне Малдовы статусам назіральніка. Дзяржавы — члены саюза таксама падпісалі часовае пагадненне, якое вядзе да ўтварэння зоны свабоднага гандлю з Іранам, і пагадненне аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве з Кітаем.

Разам з тым Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што існуюць важныя пытанні, якія да гэтага часу застаюцца нявырашанымі. Аляксандр Лукашэнка спыніўся на кожным з іх і прадставіў пазіцыю беларускага боку па іх вырашэнні.

«Я вымушаны пра гэта гаварыць, але буду казаць не з пункту гледжання стогну і рыданняў, а з пункту гледжання таго, што мы дамовіліся, але не зрабілі. І з пункту гледжання таго, што наш саюз (на шчасце, я быў каля вытокаў яго стварэння) утвараўся на пэўнай свабодзе перамяшчэння рабочай сілы, капіталаў, паслуг, тавараў. І самае галоўнае, пра што мы дамаўляліся, ствараючы нашу адзіную эканоміку, што ўсе суб'екты гаспадарання і нашы людзі будуць мець роўныя ўмовы. Калі такіх роўных умоў няма, то няма і саюза», — адзначыў беларускі лідар.

## Выключыць пратэкцыянізм

Прэзідэнт канстатаваў, што ў пачатку 2018 года Расія ў якасці старшыні ў органах ЕАЭС працягнула працу па ліквідацыі бар'ераў, выключэнняў і абмежаванняў, якія перашкаджаюць фарміраванню агульнага рынку ЕАЭС. «Гэта сапраўды адна з самых вострых праблем нашага саюза, якая яшчэ некалькі гадоў таму была пазначаная беларускім бокам. Аднак гэтае пытанне вырашаецца недапушчальна марудна. Больш за тое, на змену бар'ерам, якія ліквідаваліся, узводзяцца новыя. І гэта стала практыкай», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што гэта цалкам недапушчальная сітуацыя, якая парушае дасягнутыя дамоўленасці. «Як паказала практыка, важна не толькі знімаць перашкоды, але і паралельна ствараць умовы, якія выключаюць магчымасць іх паўторнага ўзнікнення. У гэтай сувязі прапаную даць нашай Еўразійскай эканамічнай камісіі паўнамоцтвы прымаць рашэнні ў выпадку паўторнага ўвядзення якой-небудзь дзяржавай-удзельніцай абмежаванняў або падаўжэння ўжо дзеючых», — сказаў ён.

На думку беларускага боку, гэта не закране нацыянальныя інтарэсы дзяржаў, пры гэтым дазволіць выключыць пратэкцыянізм, які наносіць сур'ёзную шкоду інтэграцыйным працэсам. «Усе, хто сядзіць за гэтым сталом, на сусветны пратэкцыянізм у гандлі адрэагавалі, абазваўшы яго груба — эканамічныя войны. Дык навошта ў сябе ствараем іх? — спытаў Прэзідэнт. — Трэба таксама павысіць адказнасць прадстаўнікоў выканаўчай улады нашых краін за прынятае рашэнне, якія ідуць насуперак прынцыпам, што замацаваны ў нашым дагаворы аб саюзе».

## Сфарміраваць агульныя рынкі

Беларусь выступае за забеспячэнне ўсёабдымнага і безумоўнага выканання ўсімі дзяржавамі ЕАЭС саюзных нормаў і ўзятых на сябе абавязацельстваў. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што бакі дамовіліся да 2025 года стварыць агульныя рынкі газу, нафты і нафтапрадуктаў.

«Мы абавязаны выканаць усё ў намечаныя тэрміны і забяспечыць працу саюза ва ўмовах стабільнай і справядлівай паліўна-сыравіннай палітыкі, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — У саюзніцкіх адносінах няма інтарэсаў пастаўшчыкоў і спажыўцоў энергарэсурсаў. Ёсць цэласная сістэма — Еўразійскі эканамічны саюз. І пад гэтым мы канцэптуальна і канкрэтна падпісаліся».

Прэзідэнт выказаў салідарнасць з меркаваннем расійскага боку пра важнасць развіцця новых сфер супрацоўніцтва, у тым ліку атамнай энергетыкі і аднаўляльных энергакрыніц. Аднак, заўважыў ён, адсутнасць згоды па прынцыпах фарміравання асноўнага нафтагазавага рынку не дазваляе ЕАЭС прагрэсаваць больш хуткімі тэмпамі. Рашэнне гэтага ключавога пытання дазволіць краінам прыступіць да засваення і іншых напрамкаў.

Ён прывёў прыклад, які датычыцца пытання раўнапраўя і роўнасці ў ЕАЭС: «Дзеючы парадак цэнаўтварэння на прыродны газ, які пастаўляецца ў Беларусь: тарыф, які ўжываецца «Газпромам» для беларускага боку на транспарціроўку газу з Ямала-Нянецкай аўтаномнай акругі да нашай мяжы складае амаль тры долары за 1 тысячу кубічных метраў на 100 кіламетраў, у той час як унутрырасійскі тарыф — каля 1 долара».

З улікам гэтых абставін газ на мяжы са Смаленскай вобласцю абыходзіцца Беларусі па цане амаль 130 долараў за 1 тысячу кубічных метраў, а ўсталяваная аптовая цана для спажыўцоў у Смаленскай вобласці Расіі — 70 долараў. Гэта амаль у два разы ніжэй. «Простае пытанне: як канкураваць у гэтай сітуацыі?» — спытаў Прэзідэнт Беларусі.

## Лічбавізаваць эканоміке

Гэтая тэма прадметна абмяркоўвалася кіраўнікамі дзяржаў на сустрэчы ў вузкім фармаце. Перад краінамі стаяць амбіцыйныя задачы па пераходзе на сучасныя тэхналогіі і мадэлі вытворчасці. «Ад таго, наколькі зладжана мы зможам аб'яднoўваць патэнцыял нашых дзяржаў праз лічбавыя рашэнні, будзе залежаць эфектыўнасць інтэграцыі і ў цэлым будучыня саюза, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Беларусь гатовая да паўнавартаснага ўдзелу ў рэалізацыі праектных ініцыятыў лічбавага парадку ЕАЭС».

У першую чаргу гаворка ідзе аб лічбавым гандлі і кааперацыі, электроннай лагістыцы, фарміраванні лічбавых транспартных калідораў, развіцці дакладных тэхналогій у сельскай гаспадарцы і прамысловасці.

«Мы ў Беларусі займаемся лічбавізацыяй вельмі даўно. Зыходзячы з нашага вопыту, павінен сказаць: цяпер модна казаць пра лічбавізацыю, развіццё IT-тэхналогій. Гэта вельмі важны напрамак, гэта значна актывізуе вытворчасць, скарачае сабекошт. Але гэта, напэўна, 20—25 % сённяшняга дня. І, напэўна, доўга так будзе. А 70—75 % — гэта тая традыцыйная эканоміка, якая нас сёння корміць. Таму не трэба забываць і пра гэта», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

## Развіць касмічныя паслугі

У парадак дня цяперашняга саміту ЕАЭС таксама было ўнесена пытанне аб развіцці кааперацыі ў сферы аказання касмічных і геаінфармацыйных паслуг на аснове нацыянальных крыніц даных дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі.

«Рэалізацыя гэтай ініцыятывы з улікам яе высокага мультыплікатыўнага эфекту на развіццё сумежных галін і сектараў надасць магутны імпульс нашаму інавацыйнаму і прамысловаму супрацоўніцтву», — перакананы Прэзідэнт.

Кажучы пра перспектывы далейшага развіцця ЕАЭС, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што еўразійскае будаўніцтва павінна ахопліваць усе новыя сферы супрацоўніцтва.

«У сувязі з гэтым асабліва важна, каб праз год, а гэта будзе пяць гадоў з дня падпісання Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, мы змаглі ўбачыць канкрэтныя і адчувальныя вынікі нашай працы. Ні ў кога не павінна ўзнікаць сумненняў у тым, што ЕАЭС — гэта эфектыўны сумесны праект, накіраваны на павышэнне ўзроўню эканамічнага дабрабыту ўсіх дзяржаў-членаў», — рэзюмаваў беларускі лідар.

## І — не спыняцца!

Пасля завяршэння выступлення Аляксандра Лукашэнкі слова зноў узяў Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. «Дзякуй вялікі, паважаны Аляксандр Рыгоравіч. Калі прэса пакіне залу, мы падыскутуем. Не магу не зрабіць адну рэпліку з нагоды тарыфаў на газ. У нас выпрацаваны план руху да 2025 года, калі мы павінны ўзгадніць адзіныя рынкі нафты, нафтапрадуктаў і газу. Што датычыцца сённяшняй сітуацыі, то яна заключаецца ў тым, што важны не тарыф, а канчатковая цана газу, у якую ўключаецца гэты тарыф. Тут вы маеце рацыю. Трэба, вядома, пра гэта думаць», — сказаў ён.

Прэзідэнт Расіі прывёў даныя, што сёння для Беларусі цана за тысячу кубічных метраў газу складае 129 долараў, а ў наступным годзе будзе 127 долараў. «А ў ФРГ 250 долараў. І гэта, безумоўна, вялікая перавага для нашых саюзнікаў», — сказаў Уладзімір Пуцін.

Разам з тым ён пагадзіўся, што бакі павінны імкнуцца да поўнай уніфікацыі. «Для гэтага трэба час і іншы ўзровень інтэграцыі паміж нашымі краінамі. Гэта прадмет перагавораў», — заявіў расійскі лідар.

У адказ Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што калі ў Беларусі выпрабляецца нейкі тавар, напрыклад трактары або грузавікі, то ў гэтай прадукцыі вялікая доля камплектуючых менавіта Расійскай Федэрацыі. «Таму галоўны наш партнёр не ФРГ, а Расійская Федэрацыя. І нам трэба, каб былі роўныя ўмовы перш за ўсё ў нашай брацкай Расіі і Беларусі. Вось у чым пытанне», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

«Вы правільна сказалі: мы вызначыліся да 2025 года выйсці на гэты ўзровень. Але ключавое слова — у дадзены момант, каб мы ішлі да гэтага, а не спыніліся. Так, мы будзем яшчэ размаўляць, і ў мяне будзе да вас просьба толькі адна: каб ішлі да гэтага. Калі будзем ісці, дык і пытанняў не будзе. Мы разумеем, што за год гэтага не вырашыць», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле БелТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Парламенцкі дзённік

# Аж да крымінальнай адказнасці

### За прапаганду нацызму прапануецца караць пазбаўленнем волі да пяці гадоў



**Мужчына да 40 гадоў, неўладкаваны, не жанаты, былы або дзеючы член футбольных фан-клубаў, ці так званы скінхэд. Увогуле, «маргінальныя людзі» — такі сацыяльны партрэт прыхільніка ідэй нацызму апісаў па просьбе дэпутата міністр унутраных спраў Беларусі Ігар ШУНЕВІЧ.**

Законапраект «Аб змяненні законаў Рэспублікі Беларусь па пытанні ўзмацнення барацьбы з прапагандай нацызму і экстрэмізму» ўчора ў першым чытанні разгледзелі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

Як прыклад нагоды для ўвядзення паправак у заканадаўства Ігар Шуневіч прывёў выпадак у цягніку «Мінск — Маладзечна», калі адзін з пасажыраў дэманстраваў фашысцкія татуіроўкі. Тады іншыя грамадзяне звярнуліся да СМІ, і падзею абмяркоўвала грамадства. Пры гэтым, па словах міністра, прыхільнікі нацысцкай сімволікі не спыняюцца толькі на «зіганні» і бравіраванні адпаведнымі выявамі на сваім целе.

— Гэты выпадак адлюстраваў у цэлым пэўную тэндэнцыю, якая ўзнікла ў краіне і звязана са значным ростам неанацысцкіх і экстрэмісцкіх праяў. За апошнія тры гады колькасць зарэгістраваных фактаў грамадскай дэманстрацыі нацысцкай сімволікі вырасла ў 15 разоў, — расказаў дэпутатам міністр унутраных спраў. — МУС фіксуе цэлы шэраг злачынстваў, звязаных з праявамі неанацызму. У 2017 годзе да крымінальнай адказнасці прыцягваўся 121 кіраўнік і актыўны ўдзельнік такіх аб'яднанняў. З неанацызмам суадносна расце і экстрэмісцкая актыўнасць. За апошнія тры гады колькасць зарэгістраваных фактаў распаўсюджвання экстрэмісцкай прадукцыі вырасла ў 31 раз. Удумайцеся! У гэтым жа перыядзе ў 28 разоў вырасла колькасць зарэгістраваных злачынстваў, звязаных з распальваннем расавай, нацыянальнай і рэлігійнай варожасці.

Прычыну павелічэння ўзроўню злачынстваў такога роду міністр бачыць у падзеях у еўрапейскіх краінах, дзе растуць неанацысцкія настроі і скажаюцца падзеі Другой сусветнай вайны.

Законапраект прадугледжвае змяненні ў крымінальным, адміністрацыйным заканадаўстве і заканадаўстве па процідзеянні экстрэмізму. Па-першае, будзе скарэктаваны артыкул 130 Крымінальнага кодэксу — устанаўліваецца крымінальная адказнасць за грамадскую рэабілітацыю нацызму. Гэта дазволіць прымяніць пакаранне да пяці гадоў пазбаўлення волі. Па-другое, уводзіцца адміністрацыйная адказнасць за прапаганду грамадскага дэманстравання, выраб і распаўсюджванне не толькі нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі, а таксама сімволікі экстрэмісцкіх і тэрарыстычных арганізацый. Таксама прадугледжваецца адміністрацыйнае пакаранне за захоўванне і набыццё з мэтай збыту нацысцкай, экстрэмісцкай і тэрарыстычнай атрыбутыкі.

Поўны пералік прадукцыі з апісаннем нацысцкай, экстрэмісцкай і тэрарыстычнай сімволікі будзе размешчаны ў інтэрнэце.

Не змяняе законапраект падыходы да выкарыстання атрыбутаў і сімволікі ў музейнай, тэатральнай і кінематаграфічнай дзейнасці.

Усяго на парадку дня чарговага пасяджэння пятай сесіі ніжняй палаты парламента было дзесяць пытанняў — законапраекты ў паштовай, энергетычнай, дарожнай сферах.

Адзін з дакументаў прадугледжвае стварэнне ўмоў для выхаду на сусветны рынак беларускіх аўдытараў. Змяненні закона «Аб аўдытарскай дзейнасці» дапамогуць стварыць агульны рынак і роўныя ўмовы для ажыццяўлення аўдытарскіх паслуг у ЕАЭС і паспрыяюць павышэнню якасці гэтай дзейнасці, лічаць распрацоўшчыкі. Праект прадугледжвае ўвядзенне ў Беларусі міжнародных стандартаў аўдытарскай дзейнасці і Кодэкса этыкі. Акрамя таго, плануецца стварыць Дзяржаўны рэестр аўдытарскіх арганізацый, аўдытараў і адзінага органа самакіравання — Аўдытарскай палаты. Яна будзе функцыянаваць як грамадская арганізацыя і будзе прадугледжваць членскія ўзносы.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь»: галасаванне пачалося

**Аддаць свой голас можна з 6 па 12 снежня, паведамілі ў канцэрне «Белдзяржхарчпрам». Сёлета ў конкурсе прымаюць удзел 276 тавараў 175 арганізацый.**

На першым этапе абласнымі конкурснымі камісіямі ўжо вызначаны тавары-фіналісты і сярод іх тавары, якія прэтэндуюць на прысуджэнне статусу «Навінка года», а таксама канкурсанты, якія прэтэндуюць на прысуджэнне спецыяльнай узнагароды «Найлепшы ў рэгіёне». Матэрыялы фіналістаў прадстаўлены ў сакратарыят рэспубліканскай конкурснай камісіі.

Вызначэнне фіналістаў ажыццяўлялася па ўстаноўленых крытэрыях, якія ўключаюць усе аспекты дзейнасці арганізацыі, што аказваюць уплыў на якасць прадукцыі (вытворча-тэхналагічныя, сацыяльныя, таварна-фінансавыя, нарматыўна-метралагічныя, інфармацыйна-рэкламныя, а таксама ў галіне энергазберажэння і бяспекі).

Другі этап конкурсу прадугледжвае падвядзенне канчатковых вынікаў рэспубліканскай конкурснай камісіяй: прысуджэнне таварам звання лаўрэата конкурсу і статусу «Навінка года», вызначэнне канкурсантаў для ўзнагароджвання дыпломам «Стабільная якасць», спецыяльнымі ўзнагародамі «Найлепшы ў галіне» і «Найлепшы ў рэгіёне».

Для павышэння аб'ектыўнасці ацэнкі канкурсантаў у ацэнцы якасці іх тавараў бяруць удзел і спажыўцы. Для іх арганізавана галасаванне на сайце www.quality.gskp.by і прадугледжана магчымасць пакінуць свае водгукі ў дачыненні да канкурсантаў і якасці іх прадукцыі і паслуг.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ДЫЯЛОГ З УЛАДАЙ

**Як паказвае вопыт, суботнія тэлефонныя лініі дапамагаюць аператыўна вырашыць праблемныя сітуацыі, якія ўзнікаюць у людзей. Упершыню такі дыялог адбыўся некалькі гадоў таму. За гэты час значна павысілася эфектыўнасць работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.**

Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 8 снежня ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах з 9.00 да 12.00, у гэтую суботу іх правядуць:

старшыня БРЭСЦКАГА аблвыканкама Анатоль Васілевіч ЛІС. Тэл. 8 016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Віктар Сяргеевіч ЛАПЦЕЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

## ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### РОБАТАТЭХНІКА — ДЛЯ БУДУЧЫХ ВЫХАВАЛЬНІКАЎ

**Асновы візуальнага праграмавання і адукацыйнай робататэхнікі цяпер будуць вывучаць не толькі на фізіка-матэматычным факультэце БДПУ. Адпаведны курс сталі праходзіць і студэнты факультэтаў пачатковай і дашкольнай адукацыі.**



Заняткі праводзяцца на базе камп'ютарнай лабараторыі кафедры інфармацыйных тэхналогій у адукацыі фізіка-матэматычнага факультэта і Рэспубліканскага рэсурснага цэнтра адукацыйнай робататэхнікі БДПУ.

Студэнты атрымаюць не толькі тэарэтычныя веды. Яны навучацца ствараць анімацыйныя ролікі дыдактычнага прызначэння з дапамогай візуальнай мовы праграмавання Scratch, канструяваць адукацыйных робатаў на аснове праграмаванага канструктара Lego WeDo і інш.

Як растлумачыла **загадчык кафедры інфармацыйных тэхналогій у адукацыі Ганна КЛІМОВІЧ**, вывучэнне асноў візуальнага праграмавання і адукацыйнай робататэхнікі дапаможа будучым настаўнікам эфектыўна вырашаць прафесійныя задачы, звязаныя з развіццём у дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту лагічнага і алгарытмічнага мыслення, творчых, інжынерных і матэматычных здольнасцяў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### УКРАЎ З КРАМЫ... ПЛАЦЕЖНЫ ТЭРМІНАЛ

**У Савецкае РУУС сталіцы звярнуліся супрацоўнікі адной са сталічных крам з заявай аб знікненні плацежнага тэрмінала.**

Міліцыянеры ўстанавілі асобу зламысніка: ім аказаўся непрацуючы 41-гадовы жыхар горада. Як высветлілася, грамадзянін распіваў спіртныя напоі ў кампаніі знаёмых на вуліцы і ўбачыў, што ў краме стаяць плацежныя тэрмінал, які не замацаваны. Скарыстаўшыся магчымасцю, мужчына ўзяў тачку ў знаёмых і, пагрузіўшы туды тэрмінал, адвёз яго ў парк. Там пры дапамозе падручных інструментаў зламыснік ускрыў яго, але грошай унутры не аказалася. Тэрмінал мужчына пакінуў у парку, паведамілі ў Савецкім РУУС г. Мінска.

Заведзена крымінальная справа за крадзеж, зламыснік можа быць пазбаўлены волі на тэрмін да трох гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ЗДАЎ КВАТЭРУ ДВОЙЧЫ

І папрасіў квартарантаў даглядаць яго катоў

**У Першамайскі РУУС сталіцы паступіла паведамленне ад грамадзяніна, які сцвярджаў, што ўнёс перадаплату за арэнду жылля ўласніку кватэры, аднак засяліцца так і не змог. Частку грошай гаспадар нерухомасці вярнуў, а частку на працягу двух тыдняў так і не змог аддаць патэнцыйнаму кватаранту.**

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку ўстанавілі асобу падазраванага. Гэта быў непрацуючы 40-гадовы жыхар сталіцы, які раней прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за крадзяжы і незаконны абарот наркотыкаў.

Як растлумачыў зламыснік, на адным з інтэрнэт-парталаў ён размясціў аб'яву аб здачы кватэры ў арэнду за 250 долараў ЗША. Яму патэлефанавалі два чалавекі і дамовіліся аб праглядзе жылога памяшкання. Першага патэнцыйнага жыхара ўмовы пражывання задаволілі, і ён аддаў заклад уласніку ў памеры 200 долараў. У гэты ж дзень кватэру паглядзеў яшчэ адзін малады чалавек, які пакінуў заклад у памеры 200 рублёў. Адной з умоў уласніка было даглядаць двух катоў, якія жылі ў кватэры. Абодва кватаранты пагадзіліся, але заехаць у арандаванае жыллё так і не змаглі. Першаму патэлефанавала жонка ўласніка і расказала, што здаваць кватэру яе муж не збіраецца, бо на пастаяннай аснове жыве ў ёй сам, параіла вярнуць грошы. Аднак падазраваны змог аддаць толькі 100 долараў, астатнія на той час патраціў. Тады і паступіла заява ў міліцыю. Другі кватэраздымшчык прыехаў з рэчамі засяляцца ў арандаваную кватэру, але ўласнік яго нават не пусціў на парог і выклікаў міліцыю, сказаўшы, што невядомыя людзі пачалі грукаць да суседзяў, расказалі ў Першамайскім РУУС г. Мінска. Па факце махлярства заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Вашынгтоне развіталіся з Джорджам Бушам-старэйшым



Цырымонія прайшла ў кафедральным саборы. На памінальнай службе прысутнічалі амерыканскі лідар Дональд Трамп з першай лэдзі Мелані, а таксама чацвёра былых прэзідэнтаў ЗША з жонкамі (Барак і Мішэль Абама, Біл і Хілары Клінтан, Джымі і Разалін Картэр, а таксама Джордж Буш-малодшы з жонкай Лорай), вядомыя палітычныя дзеячы і прадстаўнікі замежных дзяржаў.

41-ы прэзідэнт ЗША будзе пахаваны на тэрыторыі прэзідэнцкай бібліятэкі пры Тэхаскім сельскагаспадарчым і машынабудаўнічым універсітэце ў горадзе Каледж-Стэйшэн (штат Тэхас).

### Пуцін: Расія адкажа адэкватна

Расія супраць разбурэння Дагавора аб ракетах сярэдняй і меншай далёкасці (ДРСМД), але вымушана будзе адказваць, калі ЗША з яго выйдуць. Аб гэтым заявіў прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін, паведамляе ТАСС.

Расійскі лідар адзначыў, што амерыканскі бок не прадставіў ніякіх доказаў нібыта парушэння Расіяй ДРСМД. «Спачатку ўсё ж такі амерыканскі бок заявіў аб тым, што ён мае намер выйсці з Дагавора аб ракетах сярэдняй і меншай далёкасці, а потым пачалі шукаць абгрунтаванні, чаму яны павінны гэта зрабіць, — адзначыў Уладзімір Пуцін. — Самае галоўнае абгрунтаванне — тое, што мы нешта парушаем. Пры гэтым, як звычайна, ніякіх доказаў парушэння з нашага боку не прадстаўляецца».

Прэзідэнт Расіі нагадаў, што ў 2002 годзе ЗША ў аднабаковым парадку выйшлі з Дагавора па процiракетнай абароне, які быў адным з краевугольных каменяў міжнароднай бяспекі ў цэлым. Цяпер, адзначыў Уладзімір Пуцін, адбываецца тое ж самае.

### У Токіа расказалі, пры якіх умовах Японія будзе гатовая да мірнага дагавора з РФ

Японскі ўрад імкнецца заключыць мірны дагавор з Расіяй такім чынам, каб у гэтым дакуменце была выразна адлюстравана пазіцыя Токіа. Пра гэта ў чацвер заявіў кіраўнік МЗС Японіі Тара Кона на пасяджэнні камітэта па знешняй палітыцы і абароне верхняй палаты парламента краіны.

«Я хачу, каб гэта быў мірны дагавор, які выразна адлюстроўваў бы думкі японскага боку. Японска-расійскія перагаворы [па мірным дагаворы] — гэта перагаворы дзвюх краін з рознымі пазіцыямі. Перагаворы вядуцца такім чынам, каб дасягнуць пагаднення, прымальнага для абодвух бакоў, і заключыць дагавор, пераадолеўшы розныя цяжкасці», — прыводзіць яго словы тэлеканал NHK.

Такім чынам міністр пракаментаваў дамоўленасць аб тым, што ён і яго расійскі калега Сяргей Лаўроў возьмуць на сябе адказнасць за вядзенне перагаворнага працэсу па мірным дагаворы.

## Надвор'е

### Туман і галалёдзіца

Мокры снег з дажджом і каля нуля

**У сярэдзіне бягучага тыдня з ростам атмасфернага ціску надвор'е палепшылася, быў невялікі мароз. Але ў гэтыя выхадныя ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць у асноўным вызначаць атмасферныя франты. Чакаецца няўстойлівае надвор'е, пойдзе мокры снег, будзе туман і галалёдзіца, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу надвор'е ў краіне будуць вызначаць атмасферныя франты. На большай частцы тэрыторыі чакаюцца ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, пераважна па захадзе з дажджом. Месцамі магчымы туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да мінус 9 градусаў, па захадзе краіны — ад мінус 1 да 1 цяпла. Днём будзе ад мінус 4 па ўсходзе да плюс 6 градусаў па захадзе краіны.

У нядзелю ўначы захаваецца ўплыў франтальных раздзелаў, а ўдзень умовы надвор'я будзе вызначаць вільготная паветраная маса атлантычнага паходжання. Уначы на большай частцы тэрыторыі, днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаецца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — ад 2 марозу да 4 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі магчымы слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, толькі ўдзень па паўднёвым захадзе краіны будзе 4—5 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Запрашальнік

### Вясёлкавы юбілей

**Вершы, музыка, фірменны гумар наўпрост з Аўцюкоў, сустрэча з героямі дзіцячых часопісаў і знакамітымі землякамі, наведванне тры ў адным кніжнай, маляванай і фотавыставкі — усё гэта абяцаюць гасцям арганізатары літаратурнага вечара «Дзялюся крыламі». Гэтая імпрэза, зладжаная да 40-гадовага юбілею пісьменніка Уладзіміра Ліпскага на пасадзе галоўнага рэдактара часопіса «Вясёлка», пройдзе ў сталічным Тэатры юнага гледача 10 студзеня 2019 года.**

У праграме творчага вечара — вершы аўтара ў выкананні народнай артысткі Беларусі Марыі Захарэвіч, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, рэжысёра і артыста Валерыя Анісенкі, пісьменнікаў Анатоля Зэкава і Васіля Дранько-Майсюка, папулярнага спевака Івана Буслая, пераможцаў рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка» і іншых цікавых персон. Акрамя таго, павіншаваць любімага пісьменніка прыедуць госці з розных куткоў краіны: чытачы дзіцячых часопісаў «Вясёлка» і «Буся», сябры — народныя гумарысты з Аўцюкоў, акцёры батлеечнага тэатра бібліятэкі імя Васіля Віткі, якія «ажывяць» урыўкі з розных кніг Уладзіміра Ліпскага. Акрамя таго, госці імпрэзы змогуць ацаніць выстаўку фатографа і відэографа Дзмітрыя Сапсая, выстаўку малюнкаў да новага рамана Уладзіміра Ліпскага «Цар», што рыхтуецца да выдання, набыць кнігі і часопісы «Вясёлка», «Буся» і «Домік» — і адразу атрымаць аўтограф пісьменніка.

Білеты на літаратурны вечар «Дзялюся крыламі» ўжо можна заказаць у касах тэатра.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

Новыя паслугі

# КУЛОН ХУТКАГА РЭАГАВАННЯ

## Персанальная медыцынская сігналізацыя дапаможа пажылым

**У наступным годзе Мінгарвыканкам плануе ўкараніць дадатковую меру сацыяльнай падтрымкі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны — паслугу выкліку экстраннай дапамогі спецыяльнай мабільнай універсальнай прыладай. Гэта так званы дыстанцыйны патранаж дома.**




У сувязі з гэтым камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і камітэт па ахове здароўя Мінгарвыканкама, а таксама Мінскае гарадское ўпраўленне МНС сумесна з ветэранамі вайны і працы пратэсціравалі дадзены сэрвіс ад цэнтра дапамогі «Лінія жыцця 24», каб праверыць якасць паслугі. Удзел у пілотным праекце прынялі пажылыя маламабільныя, адзінокія або адзінока пражываючыя людзі.

Персанальная медыцынская сігналізацыя «Лінія жыцця 24» — гэта сістэма маніторынгу і экстраннага выкліку дапамогі для пажылых людзей. Яна ўяўляе сабой спецыяльны кулон, адзін націск на які дазваляе чалавеку не толькі падаць сігнал SOS, але і пагаварыць з аператарам. Убудаваны модуль GPS (геалакацыя) можа вызначыць, дзе пенсіянер знаходзіцца, а адмысловы датчык падзення паведаміць, што з чалавекам нешта здарылася, калі ён сам не ў сілах нічога сказаць, напрыклад страціў прытомнасць.

Як паказвае практыка, большасць няшчасных выпадкаў з пажылымі людзьмі здараецца, калі яны знаходзяцца адны, без сведак. Старому складана, а часта і проста немагчыма пры гэтым дацягнуцца да тэлефона, а непрытомны чалавек сам сабе дапамагчы не можа. Між тым медыкі добра ведаюць, што ў выпадку інсульту ці інфаркту вельмі важна аказаць медыцынскую дапамогу як мага хутчэй — гэта так званае правіла залатой гадзіны. Тады імавернасць ускладненняў і смерці зніжаецца ў пяць разоў — так сцвярджае сусветная статыстыка.

На «Лініі жыцця 24» кругласутачна дзяжурыць аператар з медыцынскай адукацыяй і практычным вопытам працы ў медыцынскіх установах. Ён вызначае прычыну выкліку, а калі чалавек знаходзіцца без прытомнасці, то па яго месцазнаходжанні (якое, нагадаем, аўтаматычна вызначае функцыя геалакацыі) накіроўвае неабходную дапамогу, перш за ўсё «хуткую». Пры неабходнасці таксама далучае МНС, міліцыю і іншыя службы, паведамўшы ўсю патрэбную інфармацыю аб абаненце (яна ўжо захоўваецца ў базе даных, бо з уладальнікам «трывожнай кнопкі» або яго найбліжэйшымі сваякамі папярэдне заключаецца дагавор аб абслугоўванні).

Аператар таксама кантралюе, каб выклік прынялі ў хуткай дапамозе ці іншай экстраннай службе і накіравалі сваіх спецыялістаў, дыстанцыйна трымае сувязь з пацыентам да іх прыезду, падтрымлівае яго псіхалагічна, затым даведваецца, у якую бальніцу чалавека адвезлі ці якая іншая дапамога была аказана, і перадае інфармацыю аб гэтым яго сваякам.

— Дадзены сэрвіс арыентаваны на пажылых, людзей з хранічнымі захворваннямі, у якіх існуе рызыка рэзкага пагаршэння самаадчування аж да страты прытомнасці, інвалідаў, адзінокіх, якім важна адчуванне дапамогі і падтрымкі ў экстраннай сітуацыі, — адзначае **адзін з заснавальнікаў цэнтра дапамогі «Лінія жыцця 24» Уладзімір КАЗАКОЎ**. — Акрамя таго, сэрвіс проста неабходны людзям, якія пакутуюць на дэменцыю, бо дазваляе аператыўна і з высокай дакладнасцю вызначаць месцазнаходжанне чалавека, які мог згубіцца з-за праваду ў памяці.

Падобныя службы догляду пажылых людзей і асоб з хранічнымі захворваннямі ўжо каля 30 гадоў паспяхова працуюць у многіх краінах свету. І іх папулярнасць расце з кожным годам. На Захадзе лічаць кожную капейку і разумеюць, што інсульт ці інфаркт, які пачынаюць лячыць са спазненнем, выліваецца ў значныя сумы грошай — і для саміх людзей, і для дзяржавы, і гэта ўжо не кажучы пра іншыя, нематэрыяльныя страты.

Уладзімір Казакоў упэўнены, што праекты, падобныя да «Лініі жыцця 24», абавязаны імкнуцца да супрацоўніцтва з дзяржавай. «На развітых рынках такія сэрвісы існуюць галоўным чынам дзякуючы страхавой медыцыне, якая падтрымліваецца дзяржавай. Таму мы звярнуліся па падтрымку і працуем сумесна з камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, — падзяліўся ён. — Паслуга выкліку экстраннай дапамогі праз мабільную ўніверсальную прыладу павысіць узровень бяспекі самастойнага пражывання ветэранаў і ў перспектыве зможа стаць адной з формаў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, якія замяняюць стацыянар».

**Святлана БУСЬКО.**

# Кантроль абароны правоў асуджаных актывізуецца

**Магчымасць паведамляць пра жаданне наведваць установы крымінальна-выканаўчай сістэмы, а не чакаць дазволу на гэта, плануюць стварыць у Беларусі для членаў камісій грамадскага кантролю. Каб актывізаваць і ўдасканаліць дзейнасць такіх камісій, пашырыць іх паўнамоцтвы, у Міністэрстве юстыцыі сумесна з Саветам Еўропы правялі адпаведны семінар.**

Назіральныя грамадскія камісіі створаны ў краіне на розных узроўнях больш як дзесяць гадоў таму з мэтай абароны правоў асуджаных. Яны фарміруюцца, дзейнічаюць і прымаюць рашэнні самастойна, акрэсліла **Алена КІРЫЧЭНКА, начальнік упраўлення па пытаннях некамерцыйных арганізацый Міністэрства юстыцыі Беларусі**:

— Мы імкнёмся ўдасканальваць і пашыраць паўнамоцтвы грамадскіх назіральных камісій. Па ініцыятыве міністэрства гадоў пяць таму, напрыклад, відазмянілі адну з нормаў пастановы Саўміна, якая рэгулюе дзейнасць грамадскіх камісій. Іх прадстаўнікам далі магчымасць гаварыць з асуджанымі без прысутнасці членаў адміністрацый гэтых устаноў. Было б няблага, каб назіральныя камісіі маглі наведваць арганізацыі крымінальна-выканаўчай сістэмы па паведамляльным прынцыпе, а не па дазвольным, як цяпер, бо бываюць жа і экстранныя выпадкі. Магчыма, камісіі змогуць фарміравацца і з членаў прафсаюзаў і праваабаронцаў, а не толькі грамадскіх аб'яднанняў, як цяпер.

**Старшыня Рэспубліканскай грамадскай назіральнай камісіі Таццяна КРАЎЧАНКА** запэўніла, што паўнамоцтваў ім збольшага хапае:

— Цяпер прыкладна за тыдзень да планаванага наведвання мы звяртаемся ў Дэпартамент выканання пакаранняў МУС і праз пару дзён атрымліваем адказ. У цэлым ніякіх перашкод на візітах у нас няма. Літаральна ўсё, што мы хацелі б паглядзець, бачым. Мы распрацавалі анкеты, якія раздаём асуджаным, і яны запаўняюць іх пры нас у адсутнасць кіраўнікоў крымінальных устаноў.

Летась члены назіральных камісій розных узроўняў наведалі 22 крымінальныя ўстановы, заўважыў **Алег СЛІЖЭЎСКІ, міністр юстыцыі Беларусі**:

— Падчас азнаямленчых гутарак узнімаюцца пытанні функцыянавання ўстаноў, умоў адбывання пакарання асуджанымі, медыка-санітарнага стану, арганізацыі вольнага часу і навучання, культурнага і працоўнага выхавання. Члены камісій наведваюць усе памяшканні, дзе размешчаны асуджаныя. Цяпер распрацоўваецца рэгламент работы грамадскіх назіральных камісій.

Дзякуючы прапановам камісій асуджаныя змаглі, напрыклад, дыстанцыйна атрымліваць адукацыю ў розных установах. А практыка работы такога грамадскага кантролю паказала неабходнасць вывучэння і магчымай рэалізацыі сучаснага замежнага вопыту ў гэтай сферы ў Беларусі.

**Ірына СІДАРОК.**

Добрая справа

# ТЫ НЕ АДЗІН...

## У Мінскім раёне ветэранаў апякуюць талакой

**Тут пражывае больш за 30 тысяч пенсіянераў, у тым ліку 12 інвалідаў і 63 удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, 8 жыхароў блакаднага Ленінграда, 149 былых вязняў фашысцкіх лагераў, 126 з іх — непаўналетнія вязні. Яны мудрыя, але часам бездапаможныя. Ёсць і адзінокія. У некаторых няма нікога, хто б мог аб іх паклапаціцца. У многіх не стае ні сіл, ні здароўя, каб выйсці з дома і дайсці да магазіна. У Мінскім раёне робяць усё неабходнае, каб падтрымаць гэтых людзей, дапамагчы ў вырашэнні жыццёвых і бытавых пытанняў.**

— Наша арганізацыя працуе ў адной звязцы з райвыканкамам, раённым Саветам дэпутатаў, упраўленнем па надзвычайных сітуацыях, тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, прафсаюзамі, дэпутатамі ўсіх узроўняў. Асабліва цесна ўзаемадзейнічаем з сельвыканкамамі, — расказаў **старшыня Мінскай раённай арганізацыі ветэранаў Анатоль МАІСЕЕЎ**. — У нас 22 ветэраны выбраны дэпутатамі сельскіх Саветаў і раённага Савета, многія — старасты вёсак. Разам з камісіяй сельвыканкамаў прадстаўнікі арганізацыі ўдзельнічаюць у абследаванні жыллёва-бытавых і матэрыяльных умоў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і асоб, якія да іх прыраўнаваныя.

У пасяджэннях Савета прэзідыума ветэранскай арганізацыі, што праходзяць з выездам на месца, прымаюць удзел дэпутаты раённага і абласнога Саветаў, Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, усе зацікаўленыя службы і структуры. Такое мерапрыемства прайшло ў Шаршунскім сельсавеце. На ім абмеркавалі жыццёва важныя для пажылых людзей сельскай мясцовасці пытанні: пажарнай бяспекі, забяспечанасці палівам.

У сельсавеце налічваецца 430 пенсіянераў, у тым ліку адзін удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, адзін вязень канцэнтрацыйнага лагера, 10 адзінокіх і 196 адзінока пражываючых грамадзян. Сёлета бясплатна завезлі дровы былому вязню Марыі Іванаўне Багдан, а работнікі камунальнага ўнітарнага прадпрыемства пры сельвыканкаме іх пасеклі і склалі. Астатнія могуць набыць дровы па льготнай цане, паколькі на тэрыторыі сельсавета ёсць лясніцтва. Пры мясцовым сельвыканкаме існуе таксама камісія па праверцы стану дамоў. Усім грамадзянам, якія адносяцца да ветэранскай арганізацыі, устаноўлены пажарныя апавяшчальнікі, людзям нагадваюць аб правілах пажарнай бяспекі.

— Сёлета 57 адзінокім і 28 інвалідам Вялікай Айчыннай вайны і па агульным захворванні ўстанавілі бясплатна пажарныя апавяшчальнікі, пяці інвалідам і сямі ўдзельнікам вайны адрамантавалі печы, — працягвае Анатоль Міхайлавіч. — Нам дапамагаюць сельскія Саветы дэпутатаў, дзе вельмі ўважліва ставяцца да пажылых людзей. Падтрымліваюць ветэранаў вайны і працы кіраўнікі шмат якіх прадпрыемстваў, дзе некалі яны працавалі. Генеральны дырэктар агракамбіната «Ждановічы» Рыгор Чуйко забяспечвае ветэранаў гароднінай. Прадпрымальнік з Калодзішчаў Іван Сачышын да Дня Перамогі выдзеліў 12 удзельнікам вайны па 200 рублёў і па прадуктовым наборы. Такую дапамогу мужчына аказвае штогод. Дарэчы, ён дэпутат Мінскага абласнога Савета.

Дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Рапс» Міхаіл Ламака родам з Крупіцы, добра ведае ўсіх ветэранаў. Калі ёсць патрэба — дапамагае нават ім матэрыяльна, а яшчэ рэгулярна возіць іх на экскурсіі.

Штогод медыцынскія ўстановы праводзяць комплексныя агляды інвалідаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і асоб, прыроўненых да іх. Вялікую ўвагу гэтым пытанням удзяляюць у Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Дарэчы, падчас пасяджэння ў Шаршунах намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Нацыянальнага сходу Беларусі Валянціна Курсевіч таксама звярнула ўвагу на пытанні медыцынскага забеспячэння ветэранаў і пенсіянераў:

— Кожны год мы імкнёмся рабіць як мага больш для гэтай катэгорыі грамадзян. Што датычыцца сацыяльных ільгот і гарантый, то яны прадугледжаны на заканадаўчым узроўні. Ветэранам, у прыватнасці гарантавана бясплатнае забеспячэнне лекамі, выраб зубных пратэзаў і шмат чаго іншага.

Валянціна Вацлаваўна высока ацаніла работу Мінскай раённай арганізацыі ветэранаў:

— Я лічу, што гэтая структура займае дастойнае месца ў краіне і сумленна выконвае свае задачы. Ветэраны зрабілі для нас вельмі шмат, і мы павінны з удзячнасцю да іх ставіцца.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**




## ЯДОМАЕ — ВЯДОМАЕ

Люблю бываць у кампаніі рыбаловаў ды паляўнічых: там столькі ўсяго пачуеш!.. А калі пашчасціць, то, можа, і сам перажывеш.

Дык вось. Неяк раз мы з сябрамі — я за рулём — паехалі на штучнае вадасховішча, хацелі парыбачыць. А Пятро, самы малодшы з нас, дык яшчэ і стрэльбу прыхапіў.

— Ці не ў плотак страляць сабраўся? — засмяяліся мы.

— А там паглядзім, — адбрахаўся паляўнічы-пачатковец.

І вось мы прыехалі на месца, разбрыліся па беразе, закінулі вуды... Пётра са стрэльбай пацягнуўся ўсцяж ракі? Ну і няхай.

Клёў у той дзень быў на славу, рыба лавілася хутка, і праз нейкі час мы ўжо сталі падумваць, каб раскладваць вогнішча ды варыць юшку... Як тут на гарызонце ўзнік Пятро — прычым... з трафеямі.

— Дзвюх андатраў падстрэліў, — пахваліўся ён.

— Брашы ды меру знай, — абаравалі яго мы, бо дакладна ведалі: андатраў тут зроду не было!

— А гэта што? — настойваў на сваім паляўнічы.

Усе разам мы сталі глядзець.

— Ды нутрыі ж! — выдаў здагадку я. — Але ж іх, як трусоў ці норак, у клетках трымаюць. Яны ў няволі жывуць.

— Ты дзе іх падстрэліў? — насеплі на паляўнічага.

— Ды вунь у той канаве, — паказаў на вёску Пятро.

Мы дружна павярнулі галовы і ўбачылі... жанчыну, якая, пільна гледзячы пад ногі (нібы шукаючы што), нетаропка ішла да нас.

Дабра ад яе візіту чакаць не даводзілася: мы мігам сабралі манаткі, селі ў машыну і рванулі з месца. Як потым аказалася, нездарма: жанчына і сапраўды шукала нутрый, якія ўцяклі з дрэнна зачыненай клеткі.

Аднак на гэтым нашы прыгоды не скончыліся, бо з сабой мы, вядома ж, бралі гарэлку. Дык што — яе везці назад?

Адшукалі добрае месца, селі выпіваць... Без юшкі, на жаль і... пакуль, бо пасля нейкай з чарак высветліла, што ў аднаго з сяброў заўтра — прафесійнае свята! Прыйшлося нам рабіць падарункі — у выглядзе рыбы, што злавілі надоечы, ды дзвюх падстрэленых нутрый.

— Шапку пашыю, — спланаваў Валодзя (ён жа віноўнік «урачыстасці»). — А што — скуркі выраблю...

— ...Тушкі — я сабакам забяру, — перапыніў яго Пётра. — Глядзі ж, не выкінь...

А мы, шчыра кажучы, і не думалі іх выкідаць: ведалі, што мяса нутрый не проста ядомае, а нават дыетычнае. Дык чаму б...

Як і варта было чакаць, працяг «банкета» адбываўся на Валодзевай дачы. На славу атрымалася там юшка! Умомант разабралася з чыгунка і мясное рагу...

— А дзе мае тушкі? — перад ад'ездам дадому спытаў Пётра.

— Няма, — адказалі мы.

— Ну, як гэта?.. Некуды ж дзеліся?

— З'еліся, — развёў рукамі Валодзя.

Пятро, рукою прыкрыўшы рот, кінуўся за рог дачы...

Што ні кажы, цікава пабываць у кампаніі паляўнічых-рыбаловаў. А яшчэ лепш — у цесным гурце сапраўдных сяброў.

**Валерый Гаўрыш,**

*г. Чавусы.*

## РАЗ, ДВА... УЗЯЛІ!

Гэтую гісторыю я чуў з дзяцінства: калі-нікалі ў вёску да нас прыязджаў дзядзька, бацькаў родны брат. Яны ўдваіх падоўгу сядзелі за сталом, размаўлялі, нешта ўспаміналі. І амаль кожны раз госць расказваў, што ўжо бываў у нашай вёсцы — некалі раней, калі мы ў ёй яшчэ не жылі, а ён працаваў шафёрам — то з Гомеля, то з Буда-Кашалёва адвозіў у Чачэрск розныя тавары.

Дык вось. Ні самой шашы, ні асфальту ў вёсцы тады не было. Ды што там — не было нават прыстойнай гравійкі: яма на яме...

У адну з іх дзядзькаў грузавік і патрапіў, прычым — нібы ў нерат: ні ўзад, ні ўперад.

А ў кузаве між тым груз. І не абы-які, а скрыні з віном... Як іх давезці да крамы, як выбрацца з гразі, дзядзька зусім не ведаў.

І тут на ягонае шчасце (ён так падумаў) да лужыны падышлі мясцовыя жыхары, прапанавалі дапамагчы — падштурхнуць машыну...

«Якія добрыя людзі ў гэтай вёсцы жывуць!», — узрадаваўся дзядзька. Ён тут жа заняў сваё месца за рулём, завёў грузавік. Мужыкі тым часам абляпілі кузаў: упёрліся хто рукамі, хто плячыма (адзін, праўда, неўпрыкмет заскочыў наверх...) і самі сабе гучна загадалі:

— Раз, два, узялі!

Грузавік хіба трошкі зрушыўся з месца.

— Хлопцы, трэба яшчэ! — скамандаваў галоўны з выратавальнікаў. — Слухай маю каманду: «Раз, два...»

Машына зноў кранулася... І нават прасунулася — на нейкі метр... (Скрыня з віном таксама... У бок бліжэйшых кустоў).

...Колькі было скрадзена, я, шчыра кажучы, ужо не помню. Помню, што ўрэшце грузавік з палёгкай выехаў на сушэйшае, што задаволены дзядзька шчыра падзякаваў мужыкам ды паехаў далей.

...Цікава, што мой бацька пра вось гэту «аперацыю» з віном пачуў адразу ж, як толькі пераехаў у вёску. Разам з іншымі мужыкамі ён шчыра смяяўся з недарэкі-шафёра. І толькі потым даведаўся, што за рулём машыны быў яго родны брат.

**Яўген Шастакоў,**

*г. Гомель.*

## НЕ БЯРЫ ЧУЖОГА: АДДАСІ СВАЁ

...Мая ўнучка расказвала, як аднойчы, сыходзячы з крамы, забылася на стале пакет. Як быццам, нічога ў ім такога каштоўнага, але ж яна вярнулася, каб забраць. І пры гэтым ледзьве не спазнілася, бо нейкая дзяўчына, убачыўшы «нічыйнае», ужо, што называецца, прыбрала яго да рук.

— Аддай! Гэта маё, — спыніла яе ўнучка.

— Не, маё! — стала тузацца зладзюжка.

На галасы як з-пад зямлі выраслі ахоўнікі.

— Спытайце, што ў гэтым пакеце, і вы адразу ўбачыце: яна не ведае, — прапанавала дзядзькам унучка. — А я — ведаю, бо гэта мой пакет...

Адчуўшы, што справа гэта дабром не скончыцца, зладзейка кінула чужое і задала такога драла, што толькі яе і бачылі...

Гэты эпізод з жыцця ўнучкі нагадаў мне іншы — свой, хоць і досыць даўні.

У той дзень я чарговым разам прыехала ў райцэнтр, і мне там, можна сказаць, пашчасціла — я дастала хлёркі. Моладзь гэты парашок, можа, і не ведае, бо цяпер для ўборкі прыбіральняў чаго толькі няма... А ў нас калісьці толькі хлёрка і была — адзіны сродак, прычым, з вельмі непрыемным рэзкім пахам.

Каб не разносіць яго па вуліцы, не «сеяць» вакол сябе, я акуратна загарнула хлёрку ці не ў сем папер. У выніку атрымаўся ладны і досыць сімпатычны пакунак, з якім можна было ехаць дадому. Праўда, перад гэтым хацела яшчэ зайсці ў сталоўку...

Скрутак палажыла на ўваходзе, каля сцяны. Там, падумала, ён нікому не будзе ні смярдзець, ні замінаць, ні вочы мазоліць... І памылілася, бо, сабраўшыся сыходзіць, убачыла, што пакунка майго няма: як скрозь зямлю праваліўся!

Ці шкадавала я яго? Ну, вядома ж, бо ў гаспадарцы, як той казаў, і траска прыдасца: па блаце яе даставала ды так старанна пакавала яшчэ...

А з іншага боку не магла, помню, стрымацца ад рогату. Злодзей жа чакаў, што ў скрутку нешта каштоўнае, добрае, што ён зараз пажывіцца. І такі ж пажывіўся!

Карацей, у зладзюг ды зладзюжак праца вельмі цяжкая і небяспечная. Мала таго, што рызыкуюць яны — маёмасцю, добрым імем, свабодай — дык часцяком яшчэ і не ведаюць, а дзеля чаго?

**Яўгенія Кулевіч,**

*Смаргонскі раён.*

## НЕ БУДЗЕ ТОЕ, ДЫК БУДЗЕ ДРУГОЕ

Кажуць, што адно добрае слова можа саграваць аж тры зімовыя месяцы. Не ведаю, як наконт усёй зімы, а вось наконт цэлага аўтобуса — гэта і сапраўды.

...Гады два таму я штодзень ездзіла на работу ў райцэнтр: далёка, за трыццаць кіламетраў. Але самым невыносным была не адлегласць, а, па-першае, аўтобус, які не абаграваўся нават зімой, па-другое — кіроўца, які ніколі нікуды не спяшаўся, хоць пасажыры і падганялі...

Той дзень пачынаўся, як звычайна: золкі ранак, халодны салон, маруда-кіроўца... Мае землякі, з гэтым даўно змірыўшыся, дарогу «скарачалі», як маглі: той-сёй баві час у размове, нехта драмаў.

Але вось на адным з прыпынкаў у салон падняўся мужчына гадоў шасцідзесяці, паздароўкаўся і гучна выдаў:

— Вяселей, вяселей, грамадзяне! Што вы, як апошняе палена ў печ укінулі! Сёння ж пятніца...

І што вы думаеце: людзі адразу ажылі-прачнуліся, заўсміхаліся, загаманілі. Сагрэла думка, што наперадзе і сапраўды — выхадныя, сагрэла... слова. Дакладней — выраз пра апошняе палена. Развіталіся з ім, значыць, застацца без цяпла... Пасярод зімы... Твар гаротніка ўявіць няцяжка...

Успамінаючы яго, усякі раз захапляюся: якое ж прыгожае, шчодрае і насамрэч цёплае — жывое роднае слова!..

І якога ж багацця пазбаўляе сябе той, хто яго цураецца.

**Ірына Матусевіч,**

*Дзяржынскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# Каложская царква Пятра і Паўла

### У што выліваецца наша абыякавасць да ўласнай гісторыі і не толькі да яе

УЯЎЛЯЮ, як здзівіў загаловак усіх, хто хоць неяк, хоць на ўзроўні школьнай праграмы валодае ведамі пра помнікі нашай архітэктуры. Я ўжо не кажу пра саміх гарадзенцаў, для якіх Каложа — больш чым сімвал іх старажытнага горада. Вы яшчэ спадзеяцеся, што я нейкую іншую царкву маю на ўвазе, не нашу Барысаглебскую? Не, шаноўныя, менавіта тую самую, нашу. А «перайменавалі» яе людзі, для якіх — што Барыс і Глеб, што Пётр і Павел — усё адно. Як, падазраю, і ўсё астатняе, што датычыцца гісторыі нашай краіны...

І ўсё б яно нічога, і не варта яно было б таго, каб пра гэта пісаць, бо і памылішся можа самы дасведчаны чалавек, і невукаў нават у самым адукаваным грамадстве хапае, калі б не адно «але». Згаданыя «ўнікальныя» звесткі пра Каложу я знайшла ў даведніку з прэтэнзійнай назвай «Гід па Беларусі», выдадзеным нашай вельмі нават самавітай канторай і ляжыць на століку ў кожным купэ цягніка «Масква — Мінск» (мяркуючы па накладзе — больш за дзве тысячы асобнікаў, ездзіць ён і ў іншых цягніках міжнародных ліній). Прыемная з выгляду кніжка, з выдатнай паліграфіяй і якасна аддрукаванымі фота. Так і цягнецца рука, каб пагартаць і пачытаць, тым больш у даволі доўгім падарожжы. Удалы маркетынгавы ход — вось так ненавязліва расказаць патэнцыйным турыстам пра Беларусь, спачатку запрасіўшы іх на буйныя спартыўныя спаборніцтвы, якія адбудуцца ў нас у хуткім часе, на наступных старонках расказаць пра гарады, прыродныя і аздараўленчыя аб'екты, якія можна і трэба ў нашай краіне наведаць...

**КАЗЯРОГ.** Можаце атрымаць прывабныя дзелавыя прапановы, але ўсё ж варта разгледзець іх з усіх бакоў, а не адразу ж прымаць. У аўторак мусяць адбыцца знаёмствы з карыснымі людзьмі. Калі на мінулым тыдні вы былі дастаткова сканцэнтраваныя і ўважлівыя, то цяпер вам забяспечаны поспех, якога вы зусім не чакалі. Намячаецца рашэнне, хоць і некалькі хваравітае, вашай сур'ёзнай праблемы, якая даўно хвалюе. Магчыма, з'явіцца шанц знайсці крыніцу дадатковага даходу.

**ВАДАЛІЎ.** Уменне імгненна арыентавацца ў складанай сітуацыі стане вызначальным фактарам на гэтым тыдні. Калі фінансавыя справы запатрабуюць хуткіх рашэнняў, паспрабуйце быць на вышыні. У сярэдзіне тыдня праявіце разумную асцярожнасць і не верце таму, хто вам лісліўіць. У сераду і ў чацвер вакол вас можа скласціся дысгарманічная атмасфера. Маўчанне ў такім становішчы будзе сапраўды залатым, спрэчкі ж паставяць адносіны на мяжу разрыву.

**РЫБЫ.** Выдатны тыдзень для нараджэння новых ідэй і пачатку смелых праектаў. Незапланаваная, цікавая сустрэча можа прывесці да заключэння выгаднага дзелавога пагаднення. Добры час для рамана і стварэння сям'і. Калі яна ў вас ужо ёсць, аддайце больш увагі дзецям. Узрасце ваш аўтарытэт, да вас пачнуць прыслухоўвацца калегі па рабоце і начальства. У выхадныя добра было б адправіцца ў рамантычнае падарожжа, якое падорыць незабыўныя ўражанні.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.13 | 16.48 | 7.35 |
| Віцебск — | 9.10 | 16.31 | 7.21 |
| Магілёў — | 9.03 | 16.38 | 7.35 |
| Гомель — | 8.53 | 16.43 | 7.50 |
| Гродна — | 9.27 | 17.05 | 7.38 |
| Брэст — | 9.19 | 17.14 | 7.55 |

## Месяц

*Маладзік у 10.20.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

**Пр.** *Кацярыны, Парфірыя, Сямёна.*
**К.** *Лілії, Марыі, Амбражэя, Марціна, Тодара.*



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Сёння купіў сшытак у 96 лістоў.**

**Пачаў пісаць ліст Дзеду Марозу.**

— Дзяўчына, будзьце маёй жонкай!

— Вось так адразу? Вы ж, напэўна, ужо жанаты?

— Ну і што, будзеце маёй каханай жонкай!

**Ніколі не варта задаваць баксёру пытанняў, на якія ён не зможа адказаць словамі.**

— А ты праўда хатняя гаспадыня?

— Так.

— Файна! А скажы штонебудзь па-хатнегаспадынську.

— Рот закрый і еш, што даюць!

**Брытанскія навукоўцы высветлілі, што калі на Зямлі знікне ежа, людзі змогуць яшчэ каля трох гадоў харчавацца адно адным.**

**Веганы вымруць першыя!**



caricatura.ru

## Даты | Падзеі | Людзі

### 7 СНЕЖНЯ

**У краіне**

**1878** год — нарадзіўся (в. Навасяды, цяпер у Ашмянскім раёне) Андрэй Зязюля (Аляксандр Сцяпанавіч Астрамовіч), беларускі паэт. Аўтар зборніка вершаў «З роднага загону», паэмы «Аленчына вяселле». Запісваў і апрацоўваў фальклорныя творы, удзельнічаў у выданні зборніка «Беларускія песні з нотамі» (т. 2). Памёр у 1921 годзе.

**1928** год — нарадзіўся (г. Мінск) Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі, беларускі вучоны ў галіне геалогіі, геатэктонікі, член-карэспандэнт, акадэмік НАН Беларусі, замежны член Расійскай АН, доктар геолагамінералагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Аўтар больш чым 550 навуковых прац па тэктоніцы і геадынаміцы платформаў, уключаючы тэрыторыю Усходне-Еўрапейскага кратона і Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Расійскай АН імя акадэміка М. С. Шацкага.

**1938** год — нарадзіўся (г. Мінск) Васіль Фёдаравіч Сумараў, беларускі жывапісец і педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Працуе ў жанры тэматычнай карціны, пейзажа, нацюрморта. Сярод твораў: «Мой дом», «Вяселле», «З веку ў век», «Сказ пра Навагрудак» ды іншыя. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

**1963** год — здадзены ў эксплуатацыю першы электрыфікаваны ўчастак Беларускай чыгункі Мінск—Аляхновічы.

**У свеце**

**1764** год — у Санкт-Пецярбургу заснаваны Дзяржаўны музей Эрмітаж. Калекцыя музея налічвае каля трох мільёнаў твораў мастацтва і помнікаў сусветнай культуры, сярод якіх «Мадонна Бенуа» Леанарда да Вінчы, «Вяртанне блуднага сына» Харменса ван Рэйна Рэмбранта і многія іншыя.



**1890** год — нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч Бакулеў, рускі хірург, адзін з заснавальнікаў грудной хірургіі ў СССР, акадэміка АН СССР, акадэмік і прэзідэнт (1953—1960) АМН СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. Арганізатар і першы дырэктар Інстытута сардэчна-сасудзістай хірургіі АМН (цяпер — імя Бакулева). Аўтар прац па хірургіі лёгкіх, лячэнні агнястрэльных раненняў. Лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР. Памёр у 1967 годзе.

**1910** год — нарадзілася Кацярына Аляксееўна Фурцава — савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч. У 1956—1960 гадах — сакратар ЦК КПСС, 1960—1974 гадах — міністр культуры СССР. Памерла ў 1974 годзе.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4523.

Нумар падпісаны ў 19.30 6 снежня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

7 снежня 2018 г. № 49 (482)

Штотыднёвы
дадатак
газеты
ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ







ТЭМА ТЫДНЯ

# БІЗНЕС НА ВЁСЦЫ:



Фота БелТА.

# НА ЧЫМ МОЖНА ЗАРАБІЦЬ?

**За год колькасць вакансій у краіне вырасла на 43 працэнты. І калі ў горадзе з пошукам работы стала прасцей (у той жа сталіцы налічваецца 17 тысяч прапаноў), то ў вёсцы праблема занятасці застаецца актуальнай. У сельскай мясцовасці запатрабаваны ветурачы, заатэхнікі, трактарысты, кіроўцы, даяркі, жывёлаводы і інжынеры, але большасць гэтых прафесій патрабуе спецыяльнай адукацыі, якой у беспрацоўнага можа не быць. Ці вакансія знаходзіцца ў іншым рэгіёне. Асабліва складана прыходзіцца жыхарам аддаленых вёсак і мястэчак, дзе налічваецца ўсяго пару дамоў.**

**Таму, калі хочаш займацца справай, прыемнай душы і кашальку, — распачынай уласны бізнес. Што з відаў дзейнасці лепш выбраць і з якімі праблемамі сутыкаюцца прадпрымальнікі–пачаткоўцы?**

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 3-й стар.

ПАРТНЁР ТЭМЫ ТЫДНЯ:






## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Для самастойнасці рэгіёнаў



У Мінску пройдзе семінар па развіцці асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў. стар. 2

### Дрывакол на субсідыю



Як распачаць сваю справу дзякуючы дзяржаўнай дапамозе. стар. 3

### Грошы са смецця



Аршанец адкрыў верміферму і займаецца вытворчасцю ўнікальнага ўгнаення. стар. 4

### Крокі да экалогіі



«МС» працягвае інтэрактыўны праект з чытачамі. стар. 15

КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 9



## Внимание — активным, инициативным и молодым

**Спикер верхней палаты белорусского парламента принял участие в торжественном заседании Молодежной палаты при Минском городском Совете депутатов.**

Торжественное заседание Молодежной палаты при Минском городском Совете депутатов с участием председателя Совета Республики Михаила Мясниковича прошло в среду, 5 декабря.

Как сообщает пресс-служба Совета Республики, в мероприятии участвовали депутаты Минского горсовета, депутаты Пермской городской Думы, члены Молодежной палаты при Парламентском собрании Союза Беларуси и России, члены Молодежного парламента при Государственной Думе Федерального Собрания Российской Федерации, члены Молодежной палаты при Новгородской областной Думе, ребята из Молодежных парламентов при Могилевском и Гродненском облсоветах депутатов и другие.

В приветственном слове Михаил Мясникович подчеркнул особую роль молодежи в развитии страны, призвал молодых парламентариев быть активными, инициативными, выдвигать свои идеи и предложения.

## Курс — на сближение

**Члены Совета Республики Алла Бодак и Виктор Чайчиц участвовали в заседаниях Комиссии Парламентского собрания по законодательству и регламенту и в Форуме приграничных регионов.**

На минувшей неделе в Москве и Брянске прошли заседания Комиссии Парламентского собрания Союза Беларуси и России по законодательству и регламенту, а также Форум приграничных территорий Республики Беларусь и Российской Федерации по законодательному обеспечению делового сотрудничества.

Как сообщается на интернет-ресурсе верхней палаты белорусского парламента, участие в этих мероприятиях принимали председатель Постоянной комиссии по законодательству и государственному строительству Алла Бодак и заместитель председателя Постоянной комиссии Виктор Чайчиц.

В центре внимания комиссии Парламентского собрания были проблемные вопросы формирования единого правового пространства Союзного государства, перспективы использования в его рамках потенциала модельного законотворчества и другие вопросы. Депутаты Парламентского собрания и ученые двух стран обменялись мнениями по проекту Концепции сближения законодательства государств — участников Договора о создании Союзного государства, а также обсудили возможности использования модельного законотворчества для унификации и гармонизации законодательства двух стран.

Форум приграничных территорий Беларуси и России по законодательному обеспечению делового сотрудничества объединил депутатов Парламентского собрания, представителей Постоянного комитета Союзного государства, Советов депутатов и исполнительных комитетов областей Беларуси, органов законодательной и исполнительной власти субъектов России, профильных министерств и ведомств двух стран, ученых, а также представителей бизнес-сообщества. Участники выработали рекомендации по обеспечению равных условий для субъектов хозяйствования двух стран, выдвинули ряд предложений по совершенствованию взаимодействия регионов в сфере торгово-экономического сотрудничества.

## Прямой диалог

**Владимир Пантюхов принял участие в заседании правления клуба директоров при Бизнес-союзе предпринимателей и нанимателей.**

На этой неделе председатель Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания по экономике, бюджету и финансам, член республиканского клуба директоров при Бизнес-союзе предпринимателей и нанимателей имени профессора М. С. Кунявского участвовал в заседании правления этого клуба.

В нем также участвовали руководители органов государственного управления, целого ряда отраслевых министерств и ведомств, депутаты, ведущие ученые из Беларуси и стран СНГ, международные эксперты.

На заседании правления клуба прозвучал отчет о работе бизнес-союза за истекший период, обсуждались проекты законов Республики Беларусь «О несостоятельности и банкротстве», «Об изменениях в Трудовой кодекс Республики Беларусь» и другие.

По мнению организаторов, подобный формат мероприятия — это уникальная возможность прямого диалога между властью и руководителями организаций различных отраслей экономики по выработке предложений и рекомендаций, направленных на формирование благоприятной деловой среды и развитие экономики нашей страны.

# СОГЛАСОВАННАЯ ПОЗИЦИЯ

**Заседание рабочей группы по вопросам выполнения поручений главы государства по доработке проекта новой редакции Налогового кодекса прошло под руководством спикера верхней палаты парламента Михаила Мясниковича.**


sovrep.gov.by

В заседании, которое состоялось в Совете Республики во вторник, 4 декабря, приняли участие заместитель главы Администрации Президента Валерий Мицкевич, первый заместитель премьер-министра Александр Турчин, представители министерств по налогам и сборам, финансов, Комитета государственного контроля, Верховного Суда, парламентарии, а также руководители бизнес-союзов.

Как сообщает пресс-служба Совета Республики, всего по статьям новой редакции кодекса поступило 34 замечания, из них 20 — входят в компетенцию рабочей группы, которую возглавляет Михаил Мясникович. К моменту проведения заседания из 20 замечаний были сняты 12. Еще восемь рассмотрели во время обсуждения, рабочая группа при этом пришла к согласованной позиции по каждому из этих пунктов.

В частности, поддержана позиция Администрации Президента Республики Беларусь по условиям приостановления операций по счетам субъектов хозяйствования по итогам проверок налоговых органов; целесообразности классификации налоговых льгот; вопросам заключения налоговыми органами мирового соглашения. Кроме того, стороны нашли взаимоприемлемое решение по условиям размещения на сайте Министерства по налогам и сборам перечня организаций и индивидуальных предпринимателей, имеющих задолженность по налогам, сборам, пеням. Также поддержана позиция Совета Министров по периодичности внесения изменений в Налоговый кодекс (не чаще, чем раз в год), условиям возврата дебиторской задолженности, обязательному страхованию должностных лиц и другим вопросам.

Доработанный проект новой редакции Налогового кодекса Республики Беларусь планируется направить на рассмотрение в Палату представителей Национального собрания до 7 декабря текущего года.

В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ

# Для повышения самостоятельности регионов

**На следующей неделе в Минске будет организован обстоятельный разговор всех заинтересованных сторон по вопросам развития регионального самоуправления в Беларуси.**

Модератором мероприятия выступит председатель Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александр Попков. Участие в семинаре примут белорусские парламентарии, руководители министерств и ведомств, депутаты местных Советов и представители общественных объединений. С системой местного самоуправления в странах, входящих в Совет Европы, познакомят эксперты Евросоюза, представив опыт Дании, Великобритании, Болгарии, Сербии и других государств. По оценкам организаторов, в обсуждении темы примут участие более 80 человек. Об этом сообщили в Совете Республики, где прошло рабочее совещание, касающееся подготовки к предстоящему семинару по вопросам развития ассоциаций местных Советов депутатов.

Как пояснил Александр Попков, для более эффективного решения вопросов жизнеобеспечения населения на местах, особенно в сельской местности, необходимо развивать и повышать роль органов местного самоуправления.

> «Проведем обстоятельный разговор по проблемам местного самоуправления и сделаем акцент на создании Ассоциаций местных Советов депутатов. Они предполагают решение значимых вопросов: это может быть и проектная, и коммерческая деятельность, и решение проблем жизнеобеспечения конкретной местности. Надо повышать уровень самостоятельности и ответственности за регион: большой и маленький.

— Во время недавнего визита в Минск директора Конгресса местных и региональных властей Совета Европы Жан-Поля Бозуля мы условились, что 11 декабря проведем обстоятельный разговор по



проблемам местного самоуправления и сделаем акцент на создании Ассоциаций местных Советов депутатов. Они предполагают решение значимых вопросов: это может быть и проектная, и коммерческая деятельность, и решение проблем жизнеобеспечения конкретной местности, — отметил он. — Надо повышать уровень самостоятельности и ответственности за регион: большой и маленький.

Именно с этой целью по итогам предстоящего семинара должна быть выработана так называемая дорожная карта дальнейших действий, которые предполагают последующее обсуждение на заседании профильной комиссии Совета Республики с разработкой конкретных предложений по повышению эффективности деятельности таких ассоциаций в Беларуси. Кстати, в стране их создано две — в Гродненской и Могилевской областях.

В дальнейшем предложения будут рассмотрены на выездном заседании Совета по взаимодействию органов местного самоуправления при Совете Республики, проведение которого запланировано на базе Гродненской области в апреле 2019 года.



**Ольга АНУФРИЕВА.**
**Фото Владимира РУСЕЦКОГО.**

УЛАСНЫ ДОСВЕД

# «ЗА СУБСІДЫЮ КУПІЎ ДРЫВАКОЛ»

## Якія бізнес можна адкрыць на грошы ад цэнтра занятасці

**Каб распачаць сваю справу, патрэбны стартавы капітал. Адзін з варыянтаў атрымаць грошы — звярнуцца ў службу занятасці па субсідыю. Для тых, хто збіраецца весці бізнес у сельскай мясцовасці, матэрыяльная дапамога складае 15 бюджэтаў пражытковага мінімуму (3,2 тысячы рублёў). На што хапае гэтых грошай?**

### «Шукала работу і ў Брэсце, і ў Мінску»

**Софія КАМЯНОЎСКАЯ** з вёскі Першамайская (Бярозаўскі раён) усё жыццё займалася дэкаратыўна-прыкладной творчасцю. Скончыла Бабруйскае мастацкае вучылішча, доўгі час была кіраўніком гуртка ў дзіцячым эстэтычным цэнтры. А потым кардынальна змяніла работу — стала прыёмнай маці для двух дзяўчынак. Калі ж праз пяць гадоў жанчына захацела вярнуцца ў творчасць, знайсці падыходзячую вакансію аказалася цяжка.

— Я шукала работу не толькі ў Бярозе, але і ў Брэсце, і ў Мінску. Але аддаваць увесь заробак за здымнае жыллё не варыянт. Прыйшла тады ў службу занятасці, расказала, што магу рабіць. Мяне адправілі на курсы па прадпрымальніцтве — вучыцца, як весці сваю справу.

Софія зарэгістравалася рамеснікам: вырашыла вырабляць святочныя аксесуары і сувеніры. Напрыклад, абрусы на стол для маладзёнаў, упрыгожаныя бутэлькі і келіхі. За субсідыю яна закупіла абсталяванне: добрую швейную машынку для вышыўкі, прас-гідраапаральнік, прыбор для выпальвання з рознымі насадкамі. Набыла таксама палатку, каб рэалізоўваць вырабы на выстаўках.

— Субсідыя — гэта добры штуршок, — лічыць жанчына, якая вось ужо тры гады працуе на сябе. — Нават тыя ж нажніцы для тканіны каштуюць дорага — беспрацоўны сабе такога не дазволіць.

Свае сувеніры Софія рэкламуе на кірмашах і ў інтэрнэце. Кажа, як толькі размясціла фота вырабаў, адразу пасыпаліся заказы.

Жанчына раіць: важна знайсці добрых пастаўшчыкоў матэрыялу. З некаторымі крамамі яна заключыла кантракт на пяць гадоў і атрымлівае 15-працэнтную зніжку на тканіны.

Кліенты Софіі ў асноўным з Бярозы. Рамесніца заўважае, што справа гэта прыбытковая: з аднаго заказу і 300 рублёў можна зарабіць. «З голаду дакладна не пamрэш», — жартуе.

### «Рабіў стаўку на бюджэтны варыянт — і памыліўся»

— Мяне заўсёды цягнула да прыватнага бізнесу. «Свабоднае плаванне» практыкаваў яшчэ ў пачатку 1990-х. Як і ўсе, працаваў па схеме «купі-прадай». Замежжа, авантуры, — успамінае **Сцяпан БУЛЬКЕВІЧ.**

Гадоў 10 таму яму дастаўся дом у вёсцы Куроўшчына Бярозаўскага раёна. Мужчына пакрысе стаў яго аднаўляць — марыў адкрыць аграсядзібу. Усё адцягвай: ну, можа ў наступным годзе. Паралельна ён працаваў механікам у Бярозе. Але прадпрыемства абанкруцілася, і Сцяпан падумаў, што самы час рэалізаваць даўнюю мару.

— Калі б ведаў, колькі гэта каштуе, напэўна, не пачынаў бы. Субсідыя пакрыла толькі маленькую частку расходаў, — прызнаецца. За грошы, выдзеленыя службай занятасці, мужчына купіў у гасцявы дом пральную машыну, тэлевізар, стол для настольнага тэніса.

Прадпрымальнік меркаваў, што сядзіба ў такім месцы абавязкова будзе карыстацца попытам: вакол — сажалкі, вадасховішча Сялец. Назбіраў для антуражу старадаўняга сялянскага начыння, падрыхтаваўся частаваць гасцей хатнім малінавым віном.

— Увесь разлік быў на рыбакоў і паляўнічых, якія ў гэту зону любяць прыязджаць. І тут не так ужо шмат месцаў, каб спыніцца. Я рабіў стаўку на бюджэтны варыянт. Аказалася, памыліўся. Бюджэтнікі аддаюць перавагу начоўцы ў палатках ці ў машынах, — дзеліцца вопытам суразмоўнік.

> За дзевяць месяцаў бягучага года субсідыі на адкрыццё сваёй справы атрымалі 1318 чалавек, з іх у сельскай мясцовасці — 248 (18,8 %).

Правёўшы работу над памылкамі, на наступны сезон Сцяпан хоча актыўней заняцца рэкламай: кліентаў было не так шмат, як разлічваў. Шалёнага прыбытку ад агратурызму прадпрымальнік не чакае. «Я не збіраюся быць мільянерам. Мне б сярэдні заробак мець, і буду задаволены».

### «З закупкамі лесу цяжка»

Летам мінулага года **Вольга ШЫДЛОЎСКАЯ** разам з мужам запусціла ўласны бізнес — нарыхтоўку і продаж дроў. Для жанчыны, у дыпломе якой запісана «цырульнік», варыянт нечаканы. Але Вольга ўдакладняе: па спецыяльнасці так і не працавала, была сацыяльным работнікам. Яна жыве ў маленькай вёсцы Камарнікі Маладзечанскага раёна, дзе ўсяго пяць дамоў. Крамы, дзіцячы садок — у суседняй вёсцы за паўтара кіламетра. Сюды заязджае толькі аўтакрама.

— Мая вёска знаходзіцца ў лесе, з дзецьмі на работу не выбраўся. Садок працуе з васьмі раніцы: пакуль малога завязеш, ужо нікуды не паспееш. Вось і вырашылі з мужам сямейны бізнес распачаць, — апісвае жанчына сітуацыю.

Муж Вольгі адвучыўся на спецыяліста па дрэваапрацоўцы. Працаваў трактарыстам, а ў вольны час падзарабляў у аднаго мужчыны, дзе калоў дровы. Сям'я і падумала: чаму б не займацца тым жа, але для сябе? І афармілі ІП.

— Разабрацца з дакументацыяй, каб зарэгістравацца і пачаць дзейнасць, сапраўды складана, — расказвае Вольга. — Даводзілася нават звяртацца па кансультацыю да бухгалтара. Вельмі шмат папер.

Атрыманай субсідыі хапіла на прафесійную бензапілу, дрывакол, расходнікі. Частку інструментаў купілі на грошы з сямейнай скарбонкі.

Каб прасоўваць свае паслугі, наваспечаныя прадпрымальнікі клеілі аб'явы на слупах, размяшчалі рэкламу ў інтэрнэце. Але лепш за ўсё спрацавала «сарафаннае радыё».

— Праз тры месяцы мы сталі на ногі. Нядаўна купілі трактар — летам на яго зарабілі, — расказвае Вольга пра поспехі.

Работа па нарыхтоўцы дроў сезонная, найбольш загружаны перыяд — лета і восень. «У жніўні—верасні, калі б давалі дровы, мы б суткамі іх вазілі. Але з закупкамі цяжка, — звяртае Вольга ўвагу на праблему. — Часам дроў не дапрасіцца — аднойчы паўтара месяца чакалі. Чаму так? Напэўна, на нас, як на дробных «іпэшнікаў», не звяртаюць увагі, лясгасам больш выгадна працаваць з аптавікамі».

Нечаканымі для вясковых прадпрымальнікаў сталі і высокія закупачныя цэны. Жанчына прыводзіць лічбы: калі фізічным асобам шэсць кубоў дроў з умовай самавывазу адпускаюць за 60 рублёў, то арганізацыі — за 140.

— Уявіце, па якой цане тады я магу іх прадаць. Для мясцовых жыхароў гэта вельмі дорага. У Маладзечне паміж нарыхтоўшчыкамі лесу моцная канкурэнцыя, плюс нелегальных гандляроў хапае. Таму мы больш арыентуемся на Ратамку, Заслаўе — там людзей не бянтэжаць нашы цэны. За год ужо нават пастаянных кліентаў напрацавалі.

### Грошы вяртаць не трэба — пры пэўных умовах

За дзевяць месяцаў бягучага года субсідыі на адкрыццё сваёй справы атрымалі 1318 чалавек, з іх у сельскай мясцовасці — 248 (18,8 %). Асноўная дзейнасць, якую абіралі прадпрымальнікі, — аказанне транспартных, цырульніцкіх паслуг, будаўніча-аддзелачныя работы, абслугоўванне аўтамабіляў, пашыў і рамонт адзення, вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі.

На працягу трох месяцаў беспрацоўны мусіць даць справаздачу, на што ён патраціў выдзеленую яму матэрыяльную дапамогу, а таксама год займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Інакш грошы давядзецца вярнуць. Субсідыя паўторна не выдаецца.

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны адзначаюць добрую тэндэнцыю: прадпрымальнікі-пачаткоўцы сталі больш «падкаванымі». Калі летась з тых, хто атрымаў сродкі на адкрыццё сваёй справы, на курсах па прадпрымальніцтве (служба занятасці арганізуе іх бясплатна) навучаліся 53,2 %, то сёлета — 61,3 %.

Што цікава, з увядзеннем паслабленняў для бізнесу, прапісаных у Дэкрэце № 7, колькасць зваротаў па субсідыі крыху скарацілася. У міністэрстве тлумачаць: пашырыўся пералік дзейнасці, якой можна займацца без рэгістрацыі ІП, і многія сталі гэтым карыстацца. А грашовая дапамога ад службы занятасці на такіх умовах не выдаецца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# Магчымасці для самазанятасці

## і развіцця бізнесу на вёсцы ёсць. Справа за ініцыятывай грамадзян

**Цішыня, прырода, а таксама недарагі кошт жылля і арэнды вытворчых плошчаў могуць садзейнічаць таму, каб адрадзіць жыццё на вёсцы. Многім людзям умовы пражывання ў сельскай мясцовасці зараз здаюцца больш камфортнымі, чым у шумным мегаполісе. Між тым, каб прыцягнуць насельніцтва ў вёску, у сельскай мясцовасці павінны быць створаны рабочыя месцы з годнай аплатай працы, лічыць старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ:**



— Цяпер склалася спрыяльнае становішча для таго, каб адкрыць сваю справу на вёсцы, і многія прадпрымальнікі пачалі ўжо выкарыстоўваць гэтыя магчымасці для развіцця малога бізнесу. Дзейнічаюць Дэкрэт Прэзідэнта № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва», указы «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання», «Аб рэгуляванні дзейнасці фізічных асоб», «Аб развіцці аграэкатурызму», «Аб ажыццяўленні фізічнымі асобамі рамеснай дзейнасці». Нарматыўныя дакументы ўхілілі залішнія адміністрацыйныя бар'еры і зрабілі пытанні арганізацыі бізнесу і самазанятасці працейшымі, зразумелымі і даступнымі для грамадзян. Задача дэпутатаў усіх узроўняў — данесці ў даступнай форме гэтую інфармацыю да кожнага чалавека.

***— Як можна ахарактарызаваць сёлетнюю сітуацыю на рынку занятасці Гомельшчыны?***

— Вынікі маніторынгу рынку працы паказваюць, што за 9 месяцаў года яна заставалася стабільнай. Паменшылася колькасць людзей, якія стаяць на ўліку беспрацоўных, павялічылася колькасць заяўленых вакансій. Сёлета за 9 месяцаў аказана садзейнічанне ў працаўладкаванні на наяўныя вакансіі і створаны працоўныя месцы для 21,6 тысячы грамадзян, у тым ліку для амаль 13 тысяч беспрацоўных. У сельскай мясцовасці працаўладкавана 2,8 тысячы беспрацоўных. Для арганізацыі рамеснай дзейнасці са сродкаў фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь вылучаны субсідыі 36 грамадзянам з ліку беспрацоўных, 8 — на арганізацыю сялянска-фермерскай гаспадаркі. Усяго ж у Гомельскай вобласці каля чатырох тысяч чалавек ажыццяўляюць рамесную дзейнасць, больш за тры тысячы чалавек ажыццяўляюць дзейнасць без дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. У тыя рэгіёны, дзе не хапае працоўных рэсурсаў, пераселена 16 сем'яў беспрацоўных грамадзян. Са сродкаў бюджэту беспрацоўным і членам іх сем'яў выдзелены грашовыя сродкі ў суме 13,4 тысячы рублёў. Для забеспячэння аграпрамысловага комплексу кваліфікаванымі кадрамі ажыццяўлялася прафесійнае навучанне 200 беспрацоўных, якія пражываюць у сельскай мясцовасці.

***— Як у вобласці выкарыстоўваецца магчымасць арганізацыі прадпрымальніцтва і вядзення бізнесу на базе дзяржаўнай маёмасці, якая не выкарыстоўвалася?***

— Для вядзення бізнесу, а таксама для рэканструкцыі пад жыллё і вядзенне дапаможнай гаспадаркі можна набыць дзяржаўную нерухомасць за адну базавую велічыню або ў бязвыплатнае карыстанне пад афармленыя дагаворам абавязацельствы па стварэнні рабочых месцаў, або бязвыплатна ва ўласнасць для рэалізацыі інвестпраектаў. Усяго ў Гомельскай вобласці на базе аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці, якія не выкарыстоўваліся, створана 1500 рабочых месцаў. Па стане на 20 лістапада сёлета ў сельскай мясцовасці рэалізаваны 70 аб'ектаў, з іх для арганізацыі вытворчасці — 18, гандлю — 12, рэканструкцыі пад жыллё і вядзенне дапаможнай гаспадаркі — 14, аграэкатурызм — 8, іншыя адміністрацыйна-гаспадарчыя мэты — 18. Такім чынам, большая частка нерухомасці набываецца менавіта дзеля вытворчых мэт. Значная колькасць нерухомасці рэалізавана прадстаўнікам малога бізнесу і індывідуальным прадпрымальнікам для арганізацыі гандлю ў сельскай мясцовасці. Нагадаю, што яшчэ летась Гомельскім абласным Саветам дэпутатаў было прынята рашэнне «Аб мерах па рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 верасня 2017 г. № 345», якім зацверджаны пералік населеных пунктаў і тэрыторый па-за населенымі пунктамі, якія адносяцца да тэрыторый сельскай мясцовасці і малых гарадскіх пасяленняў. Гэты пералік сфарміраваны на падставе прапаноў раённых Саветаў дэпутатаў і мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ВЕРМІФЕРМА: ГРОШЫ СА СМЕЦЦЯ

**Індывідуальны прадпрымальнік з вёскі Андрэеўшчына Аршанскага раёна робіць бізнес... на чарвяках. Прадае іх рыбакам, а біягумус — прадукт іх жыццядзейнасці — у якасці ўгнаення. Мужчына хоча стварыць прадпрыемства, дзе будуць працаваць сто чалавек.**

Ідэя бізнесу з'явілася, калі адзін са знаёмых папрасіў яго, чалавека ад зямлі, дапамагчы чарвякамі, каб у краме прадаваць рыбакам. Няўжо гэта дэфіцыт? Як высветлілася, не так проста ў вялікай колькасці накапаць паўзучых.

Паколькі ён не прафесійны біёлаг, прыйшлося вывучаць іх з нуля. У інтэрнэце знайшоў інфармацыю, што ёсць каліфарнійскі чарвяк і расійскі «сабрат» — старацель, якога «вывелі» падчас селекцыйнай работы ў савецкі час. Тады навукоўцы ЗША і СССР канкурыравалі не толькі ў асваенні космасу, распрацоўцы зброі, але і ў такіх пытаннях. Разумелі, што паўзучыя могуць прынесці шмат карысці, напрыклад, для развіцця экалагічна чыстай сельскай гаспадаркі...



Дзмітрый ІВАНОЎ.

Старацель, як Дзмітрый зрабіў высновy, саступае нашаму звычайнаму дзікуну. Апошні, калі можна так сказаць, менш капрызны і больш эфектыўна размнажаецца.

На маё пытанне, ці праўда, што ён «дрэсіруе» чарвякоў, каб елі паперу і іншыя бытавыя адходы, прадпрымальнік сказаў, што гэта не жарт. У іх меню могуць быць: папера, нафтапрадукты, лісце і іншае. Цікава, што пластык падыходзіць для іх харчавання, але толькі ў выглядзе дробнай крошкі.

— Наогул, калі першы раз чарвяка нечым пакарміць, ён і будзе гэта есці. Канешне, толькі не шкло, не метал, не будаўнічыя матэрыялы, — удакладняе прадпрымальнік.

Суразмоўнік расказаў, што хоча стварыць унікальнае прадпрыемства па перапрацоўцы друганай сыравіны, смецця ў біягумус. Па папярэдніх падліках, для гэтага спатрэбіцца мінімум 5000 долараў у эквіваленце. Столькі трэба будзе заплаціць за праектныя работы, экспертызы, узгадненні.

Добра, што ў райвыканкаме паабяцалі падтрымку і нават прапанавалі ўчастак зямлі пад будаўніцтва, які здаўся яму вельмі ўдалым для размяшчэння вытворчасці.

Прадпрымальнік падлічыў, што, каб міні-завод запрацаваў па поўнай, трэба будзе працаўладкаваць каля ста чалавек. Улічваючы, што гною, як і смецця, хапае, верыць, што вытворчасць будзе запатрабаваная.

А яшчэ яго арыфметыка паказала, што каб перапрацаваць куб гною, прыкладна пяці тысячам чарвякам спатрэбіцца каля двух месяцаў. Дык, калі «рабочых» мільёны, насамрэч выгадная справа. Дарэчы, жывуць чарвякі да чвэрці стагоддзя. Праўда, зімой знаходзяцца ў спячцы. Але калі побач ёсць крыніца цяпла, працягваюць актыўны лад жыцця. Таму мужчына хоча, каб на яго будучай верміферме чарвякі «працавалі» круглы год.

Пакуль жа біягумус Дзмітрый выкарыстоўвае на сваім участку зямлі. Заўважыў, што ўраджайнасць садавіны і агародніны павялічылася. Расліны і яблыні практычна не хварэюць. Лішкі біягумусу прадае. Прадукт карыстаецца попытам: увесну прадаў знаёмым дзве тоны за тыдзень.

Дарэчы, біягумус можа выкарыстоўвацца для забруджанай зямлі. Напрыклад, чэрві з'ядуць разлітыя нафтапрадукты, і зямля зноў будзе чыстая.

А яшчэ чэрві пасля перапрацоўкі ў выглядзе парашку могуць быць і якаснай дабаўкай у корм для кароў, курэй, свойскіх качак і іншых.

— Яны на сто працэнтаў засвойваюцца ў арганізме жывёл. Гэта высакакаларыйная бялковая ежа, — падкрэсліў суразмоўнік.

Як вядома, у Еўропе даўно ўжо актыўна пачалі развіваць зялёную эканоміку. І ў Кітаі ўсё больш актыўна ўкараняюць тэхналогіі без «хіміі» на зямлі, у жывёлагадоўлі. Ды і выгадна інвеставаць у чарвякоў: за пару гадоў можна акупіць укладзенае ў пяць разоў...

Дзмітрый прызнаўся, што не ён адзін спрабаваў развіваць чарвячны бізнес. Але зарабляць у ім адразу ў некалькіх кірунках, бадай, атрымалася толькі ў яго. Таму што настойлівы і ўжо, калі бярэцца за нешта, вывучае ўсё да дробязяў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДЗЕЛАВЫЯ

## Як прадпрымальніцкая жылка асобных жыхароў

**КАЛІ згадаць бізнес у вёсцы, то адразу на памяць прыходзіць Моталь. Бо там спрадвеку жылі людзі прадпрымальныя, яны ўмелі зарабляць капейку. І цяпер умеюць.**

### Ад прадпрымальных прадзедаў

Адкуль у маталян памкненні да асваення новых рамёстваў, любоў да працы, настойлівасць у дасягненні мэты, цікава разважаюць у мясцовым музеі. Тут лічаць, што ў свой час асаблівую міласць да мястэчка праявіла каралева Бона. Паводле адной з легендаў, яна праязджала праз паселішча і ўбачыла сялян, якія адрозніваліся ад іншых вонкавым выглядам. З ранку працоўнага дня яны былі чыста і прыгожа апранутыя. Менавіта тут манаршая асоба ўзяла адну са сваіх рэзідэнцый. Пазней яна прывезла з Італіі і Германіі майстроў-рамеснікаў, якія навучылі і мясцовых. Адсюль і тыповыя мотальскія прозвішчы: Кульбеда, Шыкалай, Палто...

Моталь жа атрымаў асаблівыя прывілеі, падпарадкоўваўся непасрэдна вялікаму князю, а жыхары плацілі падатак у казну, ні паншчыны не адраблялі, ні прыгону не ведалі. Варта сказаць, што да сярэдзіны XIX стагоддзя палавіну насельніцтва Моталя складалі яўрэі. Надзвычай прадпрымальныя людзі, яны, несумненна, паспрыялі росквіту мястэчка. На тагачасныя восем тысяч насельніцтва тут працавала 96 невялікіх крамаў. Гандлявалі самым разнастайным таварам. Было шмат усялякай вытворчасці. Дарэчы, дзед і бацька першага прэзідэнта Ізраіля Хаіма Вейцмана сплаўлялі тут лес у Польшчу і іншыя краіны Еўропы. Так што дух прадпрымальніцтва і цяга да сваёй справы ў Моталі выспявалі вякамі.

> «Сёння можна гаварыць не толькі пра бізнес у Моталі, але і ва ўсім сельсавеце».

Мотальскія кажухі насілі нават у Аргенціне, Бразіліі, Англіі, расказваюць у музеі. Потым у Турцыі навучыліся вырабляць скуры і навадналі сваёй прадукцыяй рынак. Недзе на рубяжы васьмідзясятых-дзевяностых гадоў жанчыны сталі за ткацкія станкі, якія захоўваліся ў кожным доме, і пачалі ткаць хусткі. З сінтэтычных нітак атрымліваліся мяккія, прыемныя на дотык хусцінкі, якія з ахвотай у час дэфіцытаў куплялі на прасторах амаль усяго былога Савецкага Саюза.

Тым часам паднімаліся першыя мотальскія прадпрымальнікі-каўбаснікі. Варта сказаць, што Сцяпана Мінюка называюць тут другім па значэнні пасля Хаіма Вейцмана земляком, які прынёс славу мястэчку. Яшчэ ў 1930-я гады ён атрымаў ліцэнзію на вытворчасць каўбас і адкрыў каўбасны цэх. З таго часу выраб каўбас не перарываўся, у савецкія часы ён вёўся пад эгідай спажыўкааперацыі. Цяпер тут працуюць тры цэхі па вытворчасці каўбас. Фермер Андрэй Мінюк, праўнук Сцяпана Мінюка, робіць каўбасу па дзедаўскіх рэцэптах.

### Бізнесмен і дэпутат

І самы буйны мясаперапрацоўчы цэх — гэта вытворчы кааператыў «Моталь», які ўзначальвае Мікалай Шыкалай. Сёння кааператыў выпускае каля трох тон мясных і каўбасных вырабаў у суткі і дае работу 73 вяскоўцам.

Пра несумненны аўтарытэт Мікалая Шыкалая можа сведчыць той факт, што вяскоўцы тры разы абіраюць яго дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета. Мікалай Сцяпанавіч гаворыць, што развіццё прадпрымальніцтва на яго радзіме, па-першае, абумоўлена гістарычна, па-другое, бізнесу спрыяюць умовы: у населеным пункце з добрай інфраструктурай кампактна пражываюць чатыры тысячы чалавек, і бізнес развіваецца, выходзіць за рамкі вёскі, да таго ж прыклад аднаго сельскага жыхара натхняе другога.

— Сёння можна гаварыць не толькі пра бізнес у Моталі, але і ва ўсім сельсавеце, — разважае дэпутат. — У суседніх Тышкавічах фермерска-сялянская гаспадарка «Знаходка Палесся» моцна стаіць на нагах. Прадпрыемства хоць і маладое, але даволі дынамічна развіваецца. Яго кіраўнік Таццяна Каткавец акрамя агароднінаводства зрабіла ўпор на вырошчванне кветак у прамысловым маштабе. І вось ужо цюльпаны з Тышкавічаў ведаюць у нашай краіне і за яе межамі. Другі сельскі прадпрымальнік заняўся дрэваапрацоўкай і дасягнуў поспеху. А пачыналася ўсё на маіх вачах у тых жа Тышкавічах, іншых вёсках з гектара зямлі, які вяскоўцы пачалі браць для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі. Лічу, што гэта добры старт для таго, каб апрабаваць сябе ў якасці гаспадара, адчуць, што бізнес гэта тваё, напрацоўваць вопыт і рухацца далей.

### Ад рыбы да пячэння

Ну а ў Моталі зараз працуе больш за 25 прыватных прадпрыемстваў. Напрыклад, прыватнае

СВАЯ СПРАВА

# ІДЭІ ДЛЯ СЕЛЬСКАГА

**Дзяржава стымулюе развіццё малога бізнесу на вёсцы з дапамогай розных ільгот, прэферэнцый. Але далёка не ўсе асмельваюцца адкрыць сваю справу. Хтосьці баіцца прагарэць, нехта проста не ведае з чаго пачаць, а камусьці не хапае навыкаў і ведаў. На дапамогу патэнцыйным бізнесменам прыходзіць інкубатар малога прадпрымальніцтва ў Мачулішчах, дзе сапраўдныя прафесіяналы вучаць, як ператварыць у жыццё цікавыя ідэі і пачаць бізнес. Нядаўна тут рэалізавалі новы праект «Акадэмія актывізацыі прадпрымальніцтва ў сельскай мясцовасці», дзе 76 жыхароў Мінскага раёна на бясплатных курсах вучыліся шыць, вышываць, вязаць шыдэлкам і пруткамі.**

— Чаму мы зрабілі стаўку менавіта на рамесніцкую дзейнасць, — разважае **кіраўнік мясцовага фонду ўстойлівага развіцця «Інавацыі для рэгіёнаў» Марына НАЙДОВІЧ.** — Прычын некалькі. Вырабы ручной работы, так званы хэнд-мэйд, карыстаюцца вялікім попытам. Па-другое, у нашай краіне створаны беспрэцэдэнтныя ўмовы для развіцця рамесніцтва. Мяркуйце самі: за адну базавую велічыню ў год кожны грамадзянін Беларусі можа зарэгістравацца рамеснікам, самастойна вырабляць прадукцыю



і прадаваць яе. Для некаторых цяпер гэта стала не толькі дадатковым, а ўжо і асноўным заробкам.

У нашых вёсках, малых і сярэдніх гарадах шмат жанчын, якія вяжуць, вышываюць, шыюць. Умельства ім перадалося ад бабуль, матуль і стала для іх хобі. Многія хацелі б навучыцца гэтаму майстэрству з нуля, а хтосьці — удасканаліць навыкі. Але не ведаюць дзе. Таму арганізатары праекта і скіравалі ўвагу на жанчын, каб даць ім сістэмныя веды, навучыць зарабляць грошы. У бізнес-інкубатары створана творчая майстэрня. Памяшканне абсталявана швейнымі машынамі, раскройнымі сталамі, закуплены неабходныя матэрыялы, аверлок. Нават пасля заканчэння праекта жанчыны змогуць збірацца разам, абменьвацца вопытам, вучыць новых майстрых. У перспектыве плануецца арганізаваць вучэбную бізнес-кампанію з дзяўчатак Калодзішчанскай школы, дзе яны змогуць шыць, рамантаваць адзенне, рабіць першыя крокі ў прадпрымальніцтве, аказваць платныя паслугі.

Тэлесеткі

# ВЯРТАННЕ «ВЯНКА»

**Да дня нараджэння Максіма Багдановіча тэлеканал «Беларусь 3» падрыхтаваў тэматычны эфір. Так, на працягу тыдня ў міжпраграмных відэароліках свае любімыя вершы паэта чытаюць людзі, вядомыя ў сферы мастацтва і культуры: Алена Спірыдовіч, Вячаслаў Шарапаў, Уладзімір Мішчанчук і іншыя.**

9 снежня праграма «Запіскі на палях. Максім Багдановіч: з дому на Радзіму» раскажа цікавыя факты, што не ўвайшлі ні ў адзін падручнік па беларускай літаратуры. А ўвечары сацыякультурны канал прапануе гледачам цыкл песень Уладзіміра Мулявіна «Вянок», які «Песняры» ўпершыню выканалі ў 1991 годзе ў Нью-Ёрку, а месяцам пазней — на сцэне Белдзяржфілармоніі, і з таго часу праграма цалкам нідзе не гучала. Адрадзіць часткова згублены нотны матэрыял удалося толькі сёлета, і праект набыў новае гучанне з Нацыянальным акадэмічным народным аркестрам імя І. Жыновіча.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 77

Дасведчаны шашачны кампазітар Генадзь Андрэеў (Латвія) зацікавіўся ідэяй, якая была паказана ў пазіцыях № 73 і 79 з мінулых выпускаў і даслаў сваю кампазіцыю на гэтую тэму. Чытачам прапануем разабрацца самастойна, ці ёсць выйгрыш пасля 1. cb8 або трэба шукаць іншы шлях да перамогі.

**№ 82**

**Белыя простыя шашкі:** a5, c7, d2, f2, g1 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, b6, d4, d8, h4 (5)

Яшчэ адну кампазіцыю Г. Андрэева прапануем рашыць самастойна.

**№ 83** Г. Андрэеў



**Белыя простыя шашкі:** b2, c7, d4, e5, g7, h4 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** c3, d2, e7, f2, f6, g5, h8 (7)

Для самастойнага рашэння ў шашкі — 100 прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

**№ 84**

**Белыя простыя шашкі:** 21, 22, 27, 32, 33, 34, 40, 44, 49 (9)

**Чорныя простыя шашкі:** 2, 8, 10, 11, 12, 13, 18, 20, 23, 35 (10)

**№ 85**

**Белыя простыя шашкі:** 26, 30, 32, 33, 34, 40 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** 9, 12, 16, 19, 22, 24, 45 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Міжнародная федэрацыя шашак (IDF) з 17 да 25 лістапада ў г. Тбілісі (Грузія) правяла Фінал Кубка свету па шашках-64 2018 года — Міжнародныя спаборніцтвы «Грузія 2018». Беларускі гросмайстар Андрэй Валюк здолеў перамагчы ў бліскавічнай і хуткай праграмах, а ў класічнай заваяваў сярэбраны медаль.

Анонс: 15—18 снежня ў Мінску (бібліятэка 20, вул. Жукоўскага, 9/1) адбудзецца Кубак Беларусі па шашках-64 і па шашках-100.

Праверце свае рашэнні: Выпуск № 76 ад 23.11.2018.

№ 78 b2, g3, b4, ef4,h8 +.

№ 80 4842, 4742, 4943, 3631,4, 20, 17,18 (13) 19 +

№81 2014, 5, 1914, 0541!, 1304, 30,34 +

Дакладныя адказы даслалі: В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей (Мядзел), У. Статкевіч (п. Зялены бор, Івацэвіцкага раёна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе — Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), В. Бандарык (Мінскі раён).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г . Мінск, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# Як раскрыць «Пін_Код»

**Маладзёжная праграма, якая ўжо чацвёрты сезон выходзіць на тэлеканале «Беларусь 2», абвясціла ў сацыяльных сетках кастынг на ролю вядучых сярод вучняў 7—11 класаў. Актыўных, ініцыятыўных і цікаўных школьнікаў запрасілі дасылаць свае рэзюмэ з фатаграфіямі і кантактамі ў раздзел «прапанаваных навін» на афіцыйнай старонцы праекта «Укантакце» vk.com/pincode_b2.**

«Толькі за першы тыдзень паступіла ўжо больш як 60 заявак», — адзначаюць стваральнікі праграмы, якія спадзяюцца праз сацыяльныя сеткі прыцягнуць як мага больш маладых людзей і падлеткаў да абмеркавання тых праблем, што сапраўды хвалююць юнае пакаленне. І раскрываюць карты: ніякага кастынгу вядучых на гэты раз не будзе, ужо на наступным тыдні кандыдаты пройдуць выпрабаванне прамым эфірам, каб пацвердзіць сваю эрудыцыю, дасціпнасць, уменне дакладна і хутка выказваць свае думкі і адстойваць меркаванні. Хто ў выніку трапіць у каманду маладзёжнага праекта «Пін_Код», а каму яшчэ не стае прафесійных якасцяў, вырашаць сумесна прадзюсары і гледачы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**








# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# Як спраўджваюцца мары

## ГАТАКА
**TV1000 10—14 снежня**



У ідэальным свеце будучыні кожны чалавек — вынік генетычнага праграмавання, і гора тым, хто нарадзіўся натуральным шляхам, без прымянення біятэхналогій, і мае хоць нейкія дэфекты. Такія людзі атрымліваюць ярлык «нявартыя» (in-valid) і пазбаўляюцца большасці жыццёвых перспектыў. Аднак чалавек «другога гатунку» Вінсент Фрымен так зацята марыць паляцець у космас, што ідзе супраць сістэмы і заключае здзелку з пакалечаным «вартым», які дазваляе карыстацца сваім генетычным матэрыялам для праходжання тэстаў...



## «ЗАЙЧЫК»
**«Беларусь 3», 15—16 снежня**

Тэатральны грымёр Зайчык, добры і шчыры, але разам з тым вельмі сціплы і сарамлівы чалавек, раптам даведваецца, што жыць яму засталося толькі месяц. І вырашае пражыць гэты час з карысцю і годнасцю, дазволіўшы сабе ўсё тое, на што раней не адважваўся: ставіць на месца хамаў, заклікаць да парадку бюракратаў, дапамагаць тым, хто трапіў у бяду. І калі высвятляецца, што смяротны дыягназ адносіўся зусім да іншага, сапраўднага зайчыка, гэта ўжо не мае значэння: Зайчык цалкам памяняўся.

## «ЛЕГЕНДА № 17»
**АНТ, 16 снежня**



У 1972 годзе хакейная зборная СССР з разгромным лікам 7:3 абыграла родапачынальнікаў гэтага віду спорту, зборную Канады з прафесійных гульцоў НХЛ, у эпахальным турніры. Гэта была больш чым гульня — супрацьстаянне дзвюх магутных дзяржаў. У адзін момант увесь свет запомніў нумар 17 Валерыя Харламава — героя таго матча, які закінуў дзве шайбы і прывёў савецкую каманду да перамогі. Але хто ведае, якім быў шлях хакеіста да вяршыні славы?




# Пазяхаў цясляр у хмызняку

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды».**

**Ці ведалі вы, што:**

**гу́ма** — эластычны матэрыял з каўчуку;

**абро́ць** — прадмет вупражы каня;

**казыта́ць** — выклікаць раздражненне;

**пазяха́ць** — хапаць паветра раскрытым ротам;

**хмызня́к** — заснікі маладых дрэўцаў;

**цясля́р** — рабочы, які займаецца апрацоўкай драўніны;

**смактаць лапу** — жыць у нястачы, галадаць (*беларусы яшчэ скажуць:* класці зубы на паліцу, сядзець на хлебе і вадзе; *рускія:* сосать лапу);

**трапіць у пераплёт** — апынуцца ў цяжкім, небяспечным ці непрыемным становішчы (*беларускія адпаведнікі:* папасціся ў нерат, трапіць у пастку; *рускі:* попасть впросак).

**Для тых, хто разважае пра свой удзел у тэлепраграме, нагадаем: каб стаць удзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Паўторы выпускаў тэлевіктарыны — у ранішнім эфіры «Беларусь-3» кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Удалы шопінг са «Звяздой»

**Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на І квартал або І паўгоддзе 2019 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе да 8 студзеня 2019 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.**

**Сярод падпісчыкаў 10.01.2019 года будуць разыграны 7 падарункавых сертыфікатаў універмага «Беларусь» на 100 рублёў і суперпрыз — падарункавы сертыфікат універмага «Беларусь» на 300 рублёў. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 20.01.2019 г.**

**Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 19.02.2019 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на І квартал або І паўгоддзе 2019 г. і пашпарта. Пасля 19 лютага выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Удалы шопінг са «Звяздой» чытайце ў 235-м нумары газеты «Звязда» ад 06.12.2018 г.**

**Тэлефон для даведак: 8 (017) 263 66 73.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 07.12.2018 па 19.02.2019 г.**



**Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3440 ад 04.12.2018 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.**

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на І квартал або І паўгоддзе 2019 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ______________________
(аддзяленне сувязі)

______________________ на І квартал або І паўгоддзе 2019 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ______

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.10** «Зона Х» (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Падарожжа да цэнтра душы» (16+).**
**12.35, 13.05, 14.35, 15.25 Меладрама «На краі кахання» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Нашы (6+).
**22.10 Серыял «След» (16+).**
**23.50** Арэна.
**0.50** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+).
**9.00, 18.35** Тэлебарометр.
**9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).**
**9.45** Капейка ў капейку (12+).
**10.25** «Вяселле ўслепую» (16+).
**12.05** М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (0+).
**12.50** Анімацыйны фільм «Братка медзведзяня» (0+).
**14.15 Камедыя «Снежныя сабакі» (12+).**
**16.00 Вестэрн «Адзінокі рэйнджар» (12+).**
**19.15** Суперлато.
**20.40, 22.05** «Тата папаў» (16+).
**22.00** КЕНО.
**23.10** Хадзі сюды і танцуй.
**23.15 Серыял «Цэнтральная бальніца» (16+).**
**0.20** Сыграй мяне, калі зможаш (12+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Свіное калена па-аўцюкоўску.
**8.05, 12.00, 19.55** Навіны культуры.
**8.25, 12.20** «Гэты дзень».
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.25, 19.15** «Легенды кіно». Надзея Румянцава (12+).
**10.05** «Навукаманія» (6+).
**10.35, 15.50 «Пена». Маст. фільм (12+).**
**12.25** «Беларуская кухня». Квас з уюнамі, хуткі хлеб.
**12.55, 21.45 «Вечны кліч». Маст. фільм (12+).**
**14.10, 21.05** «Зафрантавыя разведчыкі». Дак. серыял (12+).
**14.55** «Хата на хату».
**17.10** «Люблю і памятаю». Заслужаны артыст РСФСР Павел Луспякаеў.
**17.50 «Сляды на снезе». Маст. фільм (12+).**
**20.15** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Вера Бліншова і Любоў Кірылава.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.05** «Я хачу гэта ўбачыць!» Мазыр (6+).
**23.30** «Архітэктура Беларусі».

## Беларусь 5

**7.10** Гандбол. SEHA-Газпром ліга. «Металлург» (Македонія) — БГК імя Мяшкова.
**8.45** Вынікі тыдня.
**9.25** Біятлон. Этап кубка свету. Паклюка. Гонка пераследу. Мужчыны.
**10.20** Вялікі спорт.
**11.05, 13.45, 16.25** Спорт-мікс.
**11.15** Валейбол. Чэмпіянат Расіі. «Мінчанка» — ВК «Сахалін».
**13.15** Трэніровачны дзень.
**13.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — «Нёман» (Гродна).
**15.55** Гульні «навыраст».
**16.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ньюкасл» — «Вулверхэмптан».
**18.30** Біятлон. Этап кубка свету. Паклюка. Гонка пераследу. Жанчыны.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Віцязь» (Маскоўская вобл.). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.55** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Другі раўнд. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здорава!» (16+).
**11.10 Серыял «Дэтэктывы» (16+).**
**11.50** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Сярэбраны бор» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+).
**16.20, 23.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.30, 18.20, 0.20** «На самай справе» (16+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Чужая кроў» (16+).**
**22.20** Ток-шоу «Наша жыццё».
**1.25** «Нашы навіны». Галоўнае за дзень.

## СТБ

**5.30** «Вялікі горад».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Меншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**9.25** «Тыдзень».
**10.40** «Вёска Live».
**11.30, 23.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**12.20** «У апошні момант» (16+).
**12.35, 23.50** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45** «Дзіўная справа» (16+).
**14.40** «Вадзіць па-руску» (16+).
**15.10, 16.50 «Банды». Серыял (16+).**
**19.55, 23.00** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30 «Вострау непатрэбных людзей». Серыял (16+).**
**22.10** «Глядзець усім!» (16+).
**0.30** «Мінтранс» (16+).
**1.10** «Самая карысная праграма» (16+).

## МІР

**6.00, 10.10 Серыял «Трохі не ў сабе» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.00, 1.00** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00, 1.50** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 0.10** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.00 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.25, 2.55 Серыял «Двайная суцэльная» (16+).**
**23.45** «Спецыяльны рэпартаж» (12+).
**2.30** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.30, 14.30, 0.25 Серыял «Тайны спадарыні Кірсанавай» (12+).**
**13.35** «Наша справа» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.35** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.00** Весткі. Мясцовы час.
**17.25** «Лёс чалавека» (12+).
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40, 23.10 Серыял «Тайны следства» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**7.10** «Дзелавая раніца НТБ» (12+).
**7.55, 8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.40** «Справа жыцця. Адраджэнне» (12+).
**10.20** «Чакай мяне» (12+).
**11.15 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).**
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**16.35** «Ты не паверыш!» (16+).
**17.50** «ДНК» (16+).
**19.45 Серыял «Гаруноў» (16+).**
**21.30 Серыял «Пёс» (16+).**
**23.35** «НЗ.by».
**0.00 Серыял «Агент асобага прызначэння» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.40, 21.00, 1.05** «Надвор'е».
**7.05** М/с.
**7.25, 16.00** «Гумарынка».
**7.30 Серыял «Два з паловай чалавекі» (16+).**
**8.30 Серыял «Каханне і помста» (18+).**
**9.25, 19.45 Серыял «Мост» (18+).**
**10.35** «Здароўе».
**11.15, 18.50 Серыял «Шукальнік» (12+).**
**12.00 Маст. фільм «Доктар Ноў» (16+).**
**13.50 Серыял «Дэтэктыўныя гісторыі» (16+).**
**16.05** «Мультпарад» (0+).
**16.30** Дак. серыял «Малыя» (0+).
**17.15** «Адказвайка».
**17.20 Меладрама «Табар ідзе ў неба» (12+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05 Трылер «Пачатак» (16+).**
**23.35 Драма «Чалавек і яго сабака» (12+).**



## ВТБ

**6.05** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**6.50, 1.45** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**7.55** «Турбаміксер» (16+).
**9.00** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.25** М/ф «Джынглікі» (0+).
**9.55** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**10.25** М/ф «Царэўны» (6+).
**10.55, 3.15** «Ералаш» (6+).
**11.30** «Дзіцячы КВЗ» (6+).
**12.30** «Проста кухня» (16+).
**13.00** «Пашпарт за 24 гадзіны» (16+).
**14.05** Камедыя «Секс па дружбе» (16+).
**16.15** Камедыя «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях» (12+).
**18.25** Камедыя «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі» (12+).
**20.30** «Уральскія пельмені» (16+).
**22.00** Прыгоды «Скарбы Амазонкі» (16+).
**0.00** Серыял «Псіхалагіні» (16+).
**4.00** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

## Культура

**6.30** «Сіта і Рама». Серыял.
**9.50** «Вялікі сакрэт для маленькай кампаніі». М/ф.
**10.10** «Звычайны канцэрт».
**10.40** «Мы — грамацеі!»
**11.25** «Прыватнае жыццё». Маст. фільм.
**13.05** «Лісты з правінцыі». Табольск (Цюменская вобласць).
**13.30, 1.05** Дыялогі пра жывёл. Маскоўскі заапарк.
**14.15** 85 гадоў Валянціну Цярняўскаму. «На хвалі маёй памяці». Дак. фільм.
**15.00** Легендарныя камеды. «Хэпі-энд». Маст. фільм.
**16.10** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**16.25** «Пешшу...» Масква. 1980-я.
**17.00** «Продкі нашых продкаў». Дак. серыял.
**17.40** «Блізкае кола Юрыя Грымава».
**18.35** «Рамантыка рамансa». Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры».
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** Да 100-годдзя з дня нараджэння пісьменніка. «Ваш А. Салжаніцын». Юбілейны вечар у МХТ імя А. П. Чэхава.
**22.10** «Белая студыя».
**22.50** Да 100-годдзя Маскоўскага акадэмічнага музычнага тэатра імя К. С. Станіслаўскага і У. І. Неміровіча-Данчанкі. Спектакль «Сюіта ў белым».
**23.40** «Алёшкава каханне». Маст. фільм.
**1.45** «Шукальнікі». «Завяшчанне Бажэнава».
**2.30** «Канфлікт». «Эксперымент». «Цудоўны Гоша». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1961. 2-я частка. 2011 год (12+).
**7.00, 8.30, 9.45, 11.00, 13.00, 17.00, 18.30, 19.30, 21.45, 23.30, 2.20, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.15** «Вакол смеху». «Клубны дзень». 1983 год (12+).
**8.50, 14.50, 20.50, 2.50** «Прэс-экспрэс». 1994 год (16+).
**9.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**12.00** Маст. фільм «Дзяўчына спяшаецца на спатканне» (12+).
**13.40** «У суботу вечарам». 1986 год (12+).
**15.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**16.00** Маст. фільм «Чужы званок» (12+).
**18.00** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год (16+).
**18.50** «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Багатыя і бедныя». 1992 год (16+).
**19.50** «Погляд». 1989 год (16+).
**22.00** «Пад знакам задыяка. Вечар эпіграм». 1993 год (12+).
**0.00** Маст. фільм «Хабар» (16+).
**4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).

## EuroSport 1

**1.30, 5.00, 16.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**2.30** Веласпорт (трэк). Кубак свету.
**3.30, 6.30, 21.45** Снукер. Scottish Open.
**8.30, 13.00, 19.00** Біятлон. Кубак свету.
**9.00, 11.45, 14.45** Горныя лыжы. Кубак свету.
**10.30** Конны спорт. Global Champions Tour.
**11.30** Watts.
**18.00, 20.00** Санны спорт. Кубак свету.

## Кінакамедыя

**0.50** Каханне з рызыкай для жыцця (16+).
**2.30** Палета (16+).
**4.10** Гараскоп на ўдачу (12+).
**6.00** Забойства на траіх (12+).
**10.05** Безразважна закаханы (16+).
**12.05** Канікулы мары (12+).
**13.55** Горка! (16+).
**15.55** Горка-2! (16+).
**17.50** Джунглі (6+).
**19.30** Кахае не кахае (16+).
**21.05** Неідэальная жанчына (16+).
**23.00** Сексу шмат не бывае (18+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.00** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**10.35** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+).
**11.30** «Глядзі сам» (12+).
**11.45, 2.25** «Неспакойны ўчастак». Серыял (12+).
**15.20** «Жонка. Гісторыя кахання» (16+).
**16.45** «Чыста маскоўскія забойствы». Серыял (12+).
**20.30** «Без падману» (16+).
**21.25** «Асцярожна, махляры!» (16+).
**22.00** «Адвакат д'ябла». Трылер (16+).
**0.55** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**5.15** «Акцёрскія драмы». Дак. фільм (12+).

## ТБ1000

**8.10** Дарыян Грэй (16+).
**10.20** Чытальнік (16+).
**12.45** Каханне з падвядамленнем (12+).
**14.45** Невыносная жорсткасць (12+).
**16.35** Зялёная міля (16+).
**20.10** Аперацыя «Арго» (16+).
**22.30** З 13 у 30 (12+).
**0.30** Вар'яцкі від кахання (16+).
**2.20** Аднойчы ў Ірландыі (18+).
**4.10** Арбіта 9 (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Са дна вяршыні (12+).
**8.30** Дзень выбараў (16+).
**11.00** Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца (12+).
**12.50** Кантрыбуцыя (12+).
**16.05** Рок (16+).
**17.55** Ледакол (12+).
**20.20** Сняданак у таты (12+).
**22.10** Дзень выбараў-2 (12+).
**0.20** Дуброўскі (16+).
**2.45** Патэлефануйце Мышкіну (12+).
**4.35** Крыніца (12+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.25** Космас: прастора і час (16+).
**7.55, 4.25** Аўта-SOS (12+).
**9.30** Дзікі тунец (16+).
**11.05, 17.15, 21.15** Місія палёту да Сонца (16+).
**11.50** Інстынкт выжывання (16+).
**13.20** Невядомая планета зямля (16+).
**14.55, 2.45** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**18.00, 22.00, 1.10** Марс (16+).
**18.50** Жыццё ў космасе (16+).
**19.35** Трагедыя «Чэленджара» (16+).
**20.30** Місія: Плутон (16+).
**22.45** Асушыць акіян (16+).
**1.55** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).

## Discovery

**8.00** Патрабуецца зборка (12+).
**11.00** Залатая ліхаманка (16+).
**12.00, 23.00** Апошні нін-дзя (16+).
**13.00, 2.55** Музейныя тайны (12+).
**14.00, 2.00** Будоўля на Алясцы (12+).
**15.00** Скарбы з каморкі (12+).
**18.00, 22.00** Скрозь краtовую нару (12+).
**0.00** Гарады, якія тонуць (12+).
**1.00** Майстры зброі (16+).
**3.50** Круты цюнінг (12+).
**4.40** Геній аўтадызайну (12+).
**7.10** Мадэль для зборкі (16+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*

# ЛЮДЗІ МОТАЛЯ

## спрыяе развіццю ўсяго населенага пункта


Фота Валерыя КАРАЛЯ.

ўнітарнае прадпрыемства «Шыкалай» спецыялізуецца на перапрацоўцы рыбы. Там зараз занятыя пад два дзясяткі чалавек, і прадукцыя карыстаецца попытам. З райцэнтра, іншых гарадоў нярэдка едуць у фірменны магазін рыбаперапрацоўшчыкаў па прадукцыю. У аграгарадку і ваколіцах ужо і цяжка сказаць, які бізнес сельскагаспадарчага кірунку не прадстаўлены. Зараз асобныя прадпрымальнікі сталі займацца вырошчваннем буякоў, парэчкі, з'явілася новая піларама. Некаторыя знайшлі сябе ў гандлёвай справе. У чатырохтысячным Моталі больш за дваццаць вялікіх і малых магазінаў. У нас наогул умеюць працаваць. Наша сельгаспрадпрыемства «АграМоталь» — адно з найлепшых не толькі ў раёне, але і ў вобласці. «А калі ёсць работа, дастойная зарплата, дык людзі і не спяшаюцца пакідаць родныя мясціны», — разважае Мікалай Шыкалай.

А хто і пакідае, бывае, вяртаецца. Як, напрыклад, Мікалай Стасевіч. Яшчэ ў 90-х ён кантчаткова вярнуўся на малую радзіму, адкрыў сваю пякарню. Сёння гэта прадпрыемства «Анікс Санія» — невялікая фабрыка па вытворчасці печыва «Мотальская выпечка». Кампанія Мікалая адкрыла музей хлеба з дапамогай гранта Еўрасаюза. А каб прыцягнуць больш наведвальнікаў у музей і сваю вёску, Мікалай Стасевіч заняўся аграэкатурызмам, пабудаваў на беразе Ясельды цудоўную сядзібу «Мотальская Венецыя».

### Сацыяльная адказнасць бізнесу

Без удзелу прадпрымальнікаў сёння немагчыма ўявіць сацыяльную, культурную сферу аграгарадка, яго добраўпарадкаванне, лічыць старшыня Мотальскага сельскага Савета Сяргей Піліповіч. Той жа вытворчы кааператыў «Моталь» не раз дапамагаў інвалідам па зроку, дзецям-інвалідам, школам, музеям, выдзяляў грошы на рамонт і будаўніцтва храмаў. А фестываль «Мотальскія прысмакі», які ўпэўнена становіцца брэндам Іванаўскага раёна, мясцовыя дзелавыя людзі, можна сказаць, выпеставалі, вынеслі на сваіх плячах. Як вядома, арганізаваць і правесці падобны фестываль, прыняць такую колькасць гасцей — гэта вялікія траты. Ды і паказаць сваю прадукцыю трэба прыгожа, ярка, запамінальна. Адным словам, тутэйшыя прадпрымальнікі становяцца галоўнымі героямі і дзеючымі асобамі названага фестывалю падчас яго правядзення. А з'яўленне такога фэсту стала лагічным працягам работы ды адлюстраваннем «жылкі» мясцовых жыхароў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Іванаўскі раён.**

МЕРКАВАННЕ

**Старшы выкладчык кафедры эканомікі і кіравання Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Мінпраці і сацабароны Наталля ДОЛБІК:**



— Зразумела, на вёсцы выгадна займацца сельскай гаспадаркай: гадоўляй буйной рагатай жывёлы, свіней, трусоў, вырошчваннем бульбы (для насельніцтва і юрыдычных асоб па заказах). Прыбытковасць справы залежыць ад якасці прадукцыі, затрат на яе вытворчасць і таго, наколькі фермер гатовы ўдзяліць увагу пошуку патэнцыйных пакупнікоў. Я разумею, што канкурэнцыя вельмі вялікая, але яна ёсць усюды. Заўсёды нейкія вытворцы сыходзяць з рынку, пераходзяць у іншую сферу. Разам з тым сказаць, што ніша запоўненая на 100 працэнтаў, немагчыма ні пра які кірунак. Усё знаходзіць свайго пакупніка. Проста трэба выкарыстоўваць розныя маркетынгавыя стратэгіі.

У сельскай мясцовасці патрабуюцца таксама розныя паслугі. Той жа рамонт абутку і адзення, цырульні, фітнес, танцы, цэнтры для дзяцей. Гэтыя віды дзейнасці развіваюцца яшчэ лепш, чым гаспадарка. Калі ў Мінску такіх паслуг шмат, то ў вёсках яны ўвогуле адсутнічаюць.

Вясковыя бізнесмены могуць разлічваць на істотныя льготы. Так, згодна з Дэкрэтам № 6 «Аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці», вытворцы ўласнай прадукцыі вызваляюцца на сем гадоў ад падаткаў. Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія плацяць адзіны падатак, могуць атрымаць па ім добрыя льготы, бо мясцовыя выканаўчыя органы маюць права прымаць рашэнне аб паніжэнні гэтых ставак.

У раёнаў ёсць праграмы развіцця рэгіёнаў, на якія выдаткоўваецца пэўнае фінансаванне: тыя, хто хоча адкрыць сваю справу, могуць разлічваць на грашовую дапамогу ў рамках гэтых праграм. Плюс ёсць магчымасць атрымання грантаў. Цяпер шмат еўрапейскіх праграм аказваюць падтрымку развіццю менавіта сельскай ініцыятывы. Гранты невялікія, але для прыватніка з'яўляюцца істотнымі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# БІЗНЕСУ

## Чаму і як вучаць у інкубатары

— Я не ўмела ні вязаць, ні шыць, пачынала з нуля, — прызналася ўдзельніца праекта Юлія Пашковіч. Дзякуючы атрыманым ведам, пачала вязаць розныя дзіцячыя цацкі. Я ўжо зарэгістравалася ў якасці рамесніцы, каб зарабляць легальна. У планах — вязаць розныя рэчы: шапкі, рукавіцы, шкарпэткі. Прадаваць вырабы збіраюся на выстаўках-кірмашах, праз сетку спецыялізаваных магазінаў. Ужо з адным з іх заключыла дагавор і аддала на рэалізацыю вязаных зайцоў.

Наталля Ліпай з Калодзішчаў з гонарам дэманструе мне сваю прыгожую работу — вязаную карціну «Лета яснае».

У нашай краіне створаны беспрэцэдэнтныя ўмовы для развіцця рамесніцтва. Мяркуйце самі: за адну базавую велічыню ў год кожны грамадзянін Беларусі можа зарэгістравацца рамеснікам, ствараць сваёй працай прадукцыю і прадаваць яе. Для некаторых цяпер гэта стала не толькі дадатковым, а ўжо і асноўным заробкам.

— Я вучылася ў адной групе з Юляй. Заняткі былі настолькі цікавыя, што праходзілі на адным дыханні. Як і мая новая сяброўка, я ўпершыню ўзяла ў рукі пруткі. Настойлівасцю, стараннем дасягнула пэўных вынікаў. У далейшым з'явіўся спартыўны азарт, збіраюся афармляць рамесніцтва і прадаваць свае вырабы. Калі ты аднойчы палюбіла гэтую справу, то ўжо назаўсёды.

У былых вучаніц з 'явілася магчымасць прасоўваць свой прадукт праз інтэрнэт-платформу «Робім разам», якую адкрыў бізнес-інкубатар. Тут можна размяшчаць інфармацыю аб вырабах, работах, аб сабе, прычым, бясплатна.



Як паказвае практыка, варыянтаў і ідэй для адкрыцця сельскага бізнесу мноства. Людзі хочуць не толькі зарабляць, але і развіваць сваю малую радзіму, рабіць яе багатай. А жаданні і працавітасці вяскоўцам хапае, што засведчыў фестываль «Тутэйшая гаспадарка», які прайшоў на пляцоўцы інкубатара. На працягу двух дзён рамеснікі і фермеры прадстаўлялі сваю прадукцыю.Такім чынам яны не толькі рэалізоўвалі свае вырабы, але і заяўлялі аб сабе.

Наталля Лукашэвіч дэманстравала разнастайныя алеі — ільняны, кунжутны, грэцкага арэха, а таксама спецыі, соусы, касметычныя сродкі ручной работы. Гэта сямейны бізнес, а сыравіна рыхтуецца ў дубовай бочцы ручным спосабам. Таму прадукцыя атрымліваецца найлепшай якасці.

Рамесніца Ганна Канавалава паказала вязаныя вырабы з казінага пуху. Рэчы з яго не толькі добра саграваюць, асабліва цяпер, але і дапамагаюць пры розных захворваннях.

Словам, бізнесменам-пачаткоўцам ёсць у каго вучыцца і пераймаць вопыт.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

РЭПЛІКА З МЕСЦА

**Дзмітрый ГЕНТЭР, гаспадар аграсядзібы ў Бераставіцкім раёне:**



— Распачаць агратурыстычны бізнес пасадзейнічалі некалькі фактараў. У першую чаргу — ільготнае крэдытаванне банка і амаль адсутнасць падаткаў. Гэта добрыя дзяржаўныя прэферэнцыі, якія далі магчымасць пабудаваць дыхтоўны дом і нават стварыць вадаём. Але мы сутыкнуліся з пэўным колам праблем, якія звязаны са знаходжаннем аграсядзібы ў пагранічнай зоне. А тут ёсць свае асаблівасці. Для прыёму і размяшчэння замежных турыстаў неабходна мець спецыяльны дазвол. Бывае, што турысты едуць цераз мяжу і жадаюць прыпыніцца на аграсядзібе на некалькі дзён. Але за такі кароткі тэрмін мы не паспяваем аформіць дакументы. Гэта адбівае ахвоту ў замежнікаў, і яны едуць далей. Пастаянныя госці ведаюць такую асаблівасць пагранічнай зоны і заказваюць месцы загадзя. Напрыклад, расіяне, якія плануюць правесці тут навагодня святы, зрабілі гэта ўжо зараз.

Мы самі заказваем гэты пропуск, едзем у пагранічны атрад, падаём дакументы, аплачваем. Я чуў, што з гэтага года замежнікі могуць аформіць дазвол праз інтэрнэт, але гэтым ніхто пакуль не скарыстаўся. Для таго, каб зрабіць гэта мне, патрэбны копіі пашпартоў. Высылаць даныя пашпарта ніхто не згаджаецца. У той жа час пяць дзён для афармлення — гэта даволі працяглы тэрмін, які не спрыяе заезду турыстаў, напрыклад на ўік-энд.

Я не аднойчы спрабаваў агучыць праблему па афармленні дазволу для замежных турыстаў. Лічу, што ведамствы павінны неяк дагаварыцца паміж сабой, каб прыгранічныя аграсядзібы маглі прымаць турыстаў з-за мяжы на любы тэрмін — і кароткі, і доўгі, як пажадае сам турыст. Дарэчы, яшчэ не так даўно, у прыгранічную зону ўваходзіла значная частка Гродзенскага раёна, у тым ліку і Аўгустоўскі канал. Пасля таго як гэтыя перашкоды былі зняты, тэрыторыя набывае сапраўдны турыстычны росквіт.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# «Важна, каб з'явіўся закон аб валанцёрстве»

## Шчырая размова з сенатарам і прадстаўніком Беларускага Чырвонага Крыжа Раманіяй СКАМАРОШКА

**УСЕ ведаюць, што такое Чырвоны Крыж. Усе ведаюць, што яны дапамагаюць. Чым канкрэтна? Вось тут ужо ўзнікаюць замінкі. Наш карэспандэнт сустрэўся і пагутарыў з намеснікам генеральнага сакратара Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Раманіяй Скамарошка, каб высветліць, як сёння працуе арганізацыя. Раманія Раманаўна таксама з'яўляецца членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, таму не абышлося і без пытанняў пра гэту частку яе жыцця.**



### Хто, як і для чаго?

**— Людзі больш-менш уяўляюць, чым займаецца Міжнародны рух Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца. У агульных рысах, але без канкрэтыкі. Што Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа зрабіла важнага за няпоўны 2018 год?**

— На жаль, расчарую вас. Беларусы ў большасці сваёй не вельмі выразна ўяўляюць, чым займаецца Беларускі Чырвоны Крыж. Большасць трымае ў памяці інфармацыю аб гуманітарнай дапамозе ў гарачых кропках (гэтым, дарэчы, займаецца Міжнародны Камітэт Чырвонага Крыжа) і аб валанцёрскім руху. Вядома, гэта наступствы недахопу інфармацыі пра Беларускі Чырвоны Крыж.

Калі казаць у цэлым, то Нацыянальнае таварыства Чырвонага Крыжа аказвае падтрымку дзяржаве ў вырашэнні важных сацыяльных праблем. Беларускі Чырвоны Крыж — самая буйная гуманітарная арганізацыя ў краіне. Безумоўна, у нас ёсць свая стратэгія. Галоўныя кірункі БТЧК сугучныя з напрамкамі Міжнароднага руху Чырвонага Крыжа: медыка-сацыяльная дапамога, падрыхтоўка і рэагаванне на надзвычайныя сітуацыі, абарона інтарэсаў уразлівых катэгорый людзей, інфармаванне і навучанне, распаўсюджванне ведаў аб міжнародным гуманітарным праве і ўмацаванне патэнцыялу самой арганізацыі.

**— Як і каму дапамагае БТЧК?**

— Сёння БТЧК — гэта шэсць абласных, Мінская гарадская і Дарожная арганізацыі, больш за восем тысяч пярвічных арганізацый, каля 400 супрацоўнікаў і 17 тысяч валанцёраў.

Медыцынскія і малодшыя сёстры міласэрнасці дагледзяць дома адзінокіх людзей у пажылым узросце, людзей з інваліднасцю, псіхічнымі расстройствамі, цяжкімі хранічнымі захворваннямі, у тым ліку з анкалогіяй, хворых на сухоты, ВІЧ/СНІД. У штаце Чырвонага Крыжа каля 200 сёстраў міласэрнасці. У адной сястры міласэрнасці ў сярэднім 7—9 падапечных.

Асобны вялікі блок работы — прафілактыка інфекцыйных і неінфекцыйных захворванняў, папулярызацыя сярод жыхароў Беларусі здаровага ладу жыцця.

У рабоце па падрыхтоўцы і рэагаванні на надзвычайныя сітуацыі таксама задзейнічаны і супрацоўнікі, і валанцёры. На шчасце, Беларусь — мірная краіна, таму надзвычайныя сітуацыі, на якія гатова рэагаваць БТЧК, часцей за ўсё звязаныя са стыхіяй: маразамі, халадамі, моцнымі снегападамі, паводкай, спякотай. Тут мы цесна працуем з МНС і МУС.

У кожнай вобласці створаны валанцёрскія атрады хуткага рэагавання. У склад атрадаў уваходзяць розныя людзі: гэта і студэнты, і тыя, хто працуе: праграмісты, пажарныя-ратавальнікі, стаматолагі, псіхолагі, вадзіцелі. Прычым не толькі мужчыны, але і жанчыны. Я гатовая ў пояс пакланіцца гэтым людзям, таму што яны знаходзяць час не толькі для работы і сям'і, але і для дапамогі іншым. Валанцёры праходзяць спецыяльнае навучанне і ў выпадку неабходнасці гатовы аператыўна рэагаваць як на надзвычайныя сітуацыі, так і на пошук людзей, што згубіліся.

Многія асацыююць Чырвоны Крыж з арганізацыяй, у якой можна і трэба атрымліваць матэрыяльныя даброты. Вядома, у экстранных выпадках мы стараемся дапамагчы — прадуктамі харчавання, сродкамі гігіены, адзеннем. Беларускі Чырвоны Крыж лічыць разумным падыход, калі з прамой дапамогай спалучаюцца асабістая актыўнасць чалавека, жаданне і ўменне самому сабе дапамагаць. Пазіцыя нашай арганізацыі — працаваць з чалавекам, разбірацца ў яго праблеме, дапамагчы яму змяніць стаўленне да жыцця або сітуацыі.

Да нас рэгулярна звяртаюцца па дапамогу людзі з алкагольнай, наркатычнай залежнасцю, з інваліднасцю і рознымі захворваннямі, малазабяспечаныя.



### Аб планах

**— Чым ваша арганізацыя зоймецца ў наступным годзе?**

— Мы, вядома ж, працягнем дапамагаць людзям у складаных жыццёвых сітуацыях. Важным лічым і фарміраванне ўстойлівага партнёрства з дзяржаўнымі структурамі, іншымі НДА. Плануем у тым ліку працаваць над умацаваннем арганізацыйнага патэнцыялу.

Працягнецца работа па аказанні дапамогі пажылым людзям у іх дома.

У 2019 годзе Беларусь чакаюць дзве важныя падзеі, у якіх Чырвоны Крыж таксама ўдзельнічае. Першая — краіна будзе адзначаць 70-годдзе падпісання Жэнеўскіх канвенцый. Гэта добрая нагода расказаць аб гуманітарнай дзейнасці Чырвонага Крыжа, пра тое, што такое Жэнеўскія канвенцыі і як у мірны час працуе нацыянальнае таварыства.

Іншая падзея — гэта другія Еўрапейскія гульні, якія пройдуць летам. Мы падпісалі пагадненне з Дырэкцыяй Еўрапейскіх гульняў — навучаем валанцёраў аказваць першую дапамогу і псіхасацыяльную падтрымку ў выпадку няштатных сітуацый, а таксама вучым працаваць з натоўпам.

У наступным годзе мы плануем яшчэ больш уключыцца ў работу з людзьмі, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі. Чырвоны Крыж можа прынесці ў краіну вопыт іншых нацыянальных таварыстваў, аказаць псіхалагічную і гуманітарную падтрымку, спрыяць фарміраванню ў людзей з захворваннямі прыхільнасці да лячэння.

Мы пачалі работу па тэме жаночага алкагалізму. Навучаем такіх жанчын прафесіям, маем зносіны з сем'ямі, аказваем псіхасацыяльную падтрымку.

### Дапамажы блізкаму свайму

**— БТЧК дапамагае людзям адшукаць сваякоў, страчаных у выніку стыхійных бедстваў і ўзброеных канфліктаў. Якая гісторыя запомнілася вам больш за ўсё?**

—Аднаўленне сямейных сувязяў — гэта толькі невялікая частка працы Чырвонага Крыжа. У БТЧК ёсць партнёры ў цэлым шэрагу нацыянальных таварыстваў у многіх краінах. Да нас прыходзяць запыты, мы збіраем пакет дакументаў, потым накіроўваем яго ў неабходную краіну. Але хуткасць адказу розная, многія запыты разглядаюцца месяцамі.

Яркія гісторыі? Яны былі розныя. Напрыклад, украінская сям'я — муж і цяжарная жанчына з дзіцем вырашылі пераехаць у Беларусь з зоны канфлікту. Бацька сямейства пайшоў развітацца са сваімі сваякамі. І знік.

Сям'я без бацькі пераехала ў Беларусь. Прайшло некалькі месяцаў, мужчыну ўдалося знайсці. Уяўляеце, як было гэтай жанчыне? Апынуцца ў гушчы ваенных дзеянняў, чакаць нараджэння дзіцяці, раптам страціць мужа і з'ехаць з роднай краіны.

### Адметная рыса чалавека

**— Асобны кірунак вашай работы — збор ахвяраванняў. Растлумачце, чаму трэба ахвяраваць?**

— Папулярная тэма. І складаная. Па-першае, ніхто не можа прымусіць чалавека ахвяраваць. Інфармаваць, як гэта можна зрабіць, — так, прымушаць — не. Лагічна ахвяраваць у тым выпадку, калі ты давяраеш арганізацыі. У наш час даведацца больш аб арганізацыі нескладана: вывучыць сайт, прыйсці ў офіс, асабіста пазнаёміцца ??з супрацоўнікамі, даведацца, куды пойдуць гэтыя грошы. У рэшце рэшт, можна самому паўдзельнічаць у гэтай рабоце, а потым убачыць вынік. Ахвяруюць звычайна людзі з асаблівым сямейным выхаваннем. У кагосьці гэта асаблівасць рэлігійнай культуры, у кагосьці ёсць асабісты вопыт, калі ў сям'і здаралася гора.

Чаму варта ахвяраваць? Дарыць падарункі заўсёды прыемней, чым іх атрымліваць.

І ахвяраваць можна не толькі грошы — можна ахвяраваць свой час, свой прафесійны вопыт.

**— Сума самага вялікага ахвяравання БТЧК за апошні час ад аднаго чалавека ці арганізацыі?**

— Важная не сума, а факт удзелу ў гуманітарным праекце. Запомніўся выпадак, калі беларуская дыяспара ў іншай краіне вывучыла ў інтэрнэце адзін з нашых праектаў. Іх зачапіла тэма. Па прыездзе ў Беларусь прадстаўнікі дыяспары звярнуліся ў Беларускі Чырвоны Крыж і ахвяравалі каля 20 тысяч беларускіх рублёў.

### Людзі самі прынеслі

**— Немагчыма не закрануць тэму бежанцаў і вымушаных перасяленцаў. Людзі па-рознаму ацэньваюць гэтыя працэсы. Як прыняць бежанцаў так, каб не пакрыўдзіць свой народ?**

— У Беларусі ёсць адладжаная дзяржаўная сістэма работы ў гэтым кірунку. Яна дазваляе аператыўна ўзаемадзейнічаць усім зацікаўленым структурам, у тым ліку і Чырвонаму Крыжу. У гэтай рабоце фокус Чырвонага Крыжа — псіхасацыяльная падтрымка мігрантаў і бежанцаў, асабліва на першым этапе. Акрамя таго, важная і праца з карэнным насельніцтвам, каб людзі талерантна ставіліся да бежанцаў.

І карыстаючыся выпадкам, я дзякую жыхарам Беларусі — таму што яны ўнікальныя. Добрыя. Спагадныя. Наш народ вызначаецца тым, што памятае сваю гісторыю. Памяць пра Вялікую Айчынную вайну не дае нам крыўдзіць людзей, якія прыехалі з зон канфлікту, чулі і бачылі выбухі, тое, як снарады руйнуюць дамы.

Яшчэ адно — гэта выхаванне. Мне здаецца, талерантнасць закладзена ў нашым менталітэце. І ўсё ж праграмы талерантнасці трэба развіваць.

Прыклады? Прыехала па вясне ў невялікую вёску ў сям'ю ўкраінцаў. Пытаюся: «Як перазімавалі?» У адказ чую — добра.

«А як добра?» — «Агарод ужо не ўзорваюць, холадна, але закаткі дапамаглі».

«А дзе ўзялі закаткі?» — «Дык суседзі».

Разумееце? Беларускія суседзі падзяліліся, чым маглі.

### Замацаваць статус валанцёра

**— Вы з'яўляецеся членам камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве. Чым канкрэтна вы займаецеся? Якія законапраекты сталі для вас самымі складанымі?**

— Перш за ўсё, для мяне работа ў Савеце Рэспублікі — вялікі гонар і адказнасць.

Камісія па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве — важная камісія. Праца ў ёй патрабуе ведаў у розных галінах права, эканомікі, міжнародных адносін, сацыяльнага жыцця. Мне прыемна, што са мной працуюць людзі, якія з'яўляюцца спецыялістамі ў гэтых сферах.

Што запомнілася асабліва? Мне здаецца, што калі сенатару нешта адно запамінаецца, а астатняе — не, то гэта няправільна. Няма няважных спраў і падзей.

**— Што вы павінны зрабіць, каб па завяршэнні работы ў Савеце Рэспублікі сказаць сабе: я — малайчына, я дапамагла людзям?**

— Вельмі важным было б, улічваючы спецыфіку маёй працы, каб у Беларусі з'явіўся закон аб валанцёрстве. Ідзе работа ў гэтым кірунку.

Поўную версію інтэрв'ю чытайце на сайце газеты zviazda.by.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
**Фота прадстаўлены БТЧК.**

З ПОШТЫ «МС»

# ЦІ ПАТРЭБНЫ ПАЛІГОНЫ ЦВЁРДЫХ КАМУНАЛЬНЫХ АДХОДАЎ?

Адразу хачу выказаць словы ўдзячнасці рэдакцыі «МС» за запрашэнне падаць меркаванні па праблеме адходаў, якія ўтвараюцца ў нашай краіне. На маю думку, гэта, бадай, самая складаная з усіх экалагічных праблем. Справа ў тым, што дзякуючы эфекту рассейвання канцэнтрацыя забруджвальнікаў у атмасферы змяншаецца. Тое самае прыкладна адбываецца пры развядзенні забруджвальнікаў у водным асяроддзі. А вось цвёрдыя камунальныя адходы (ЦКА) у нашых умовах за рэдкім выключэннем не знаходзяць іншага месца, як на палігонах. Другасныя рэсурсы (папера, шкло, пластык) пры іх утылізацыі складаюць менш за 20 %. Па вялікім рахунку палігонаў, па сутнасці, быць не павінна. Менавіта такога падыходу і прытрымліваюцца сёння шматлікія развітыя краіны свету. Напрыклад, у Швецыі другасна перапрацоўваецца 50,6 % адходаў, 48,6 % спальваецца для вытворчасці энергіі, а на палігоны трапляе толькі 0,8 %. Заўважу, што гэта краіна мае прыкладна аднолькавую з намі колькасць насельніцтва, а вось плошча яе тэрыторыі больш чым у два разы перавышае нашу. Тэрыторыя ж Беларусі амаль уся антрапагенна пераўтвораная, і рэальна прыдатных зямель (не перагружаных дзейнасцю чалавека) для гаспадарчай дзейнасці практычна не засталося. Не лішнім будзе нагадаць пра чарнобыльскі след, а таксама тэндэнцыю ўсё большага адвядзення зямель пад гарадскую забудову і памяншэння іх для сельскагаспадарчых патрэб. Пэўны ўнёсак у гэты негатыўны працэс робяць і палігоны цвёрдых камунальных адходаў. Таму іншага выйсця, як паглыбляць утылізацыю ўсіх адходаў, у бліжэйшай перспектыве для Беларусі, няма.

Аднак сённяшняя рэчаіснасць сведчыць аб тым, што навукова-тэхнічны патэнцыял краіны, узровень экалагічнай культуры яе насельніцтва не ў стане забяспечыць нават 50 % утылізацыі ўтвараемых адходаў і абысціся без палігонаў немагчыма. У сувязі з гэтым найбольш актуальнай для Беларусі з'яўляецца праблема аптымізацыі выбару месцаў для стварэння палігонаў. Растлумачу, чаму. Па-першае, колькі б каляровых кантэйнераў для раздзельнага збору смецця не ставілі камунальныя службы, змяніць свядомасць людзей вельмі складана. Каб наша дзяржава сапраўды была зацікаўлена ў гэтым, яна б у сродках масавай інфармацыі і найперш на тэлебачанні «забівала» самы спрыяльны час не камерцыйнай, а экалагічнай рэкламай. Нельга скідваць з рахунку і такую акалічнасць: сярэднія памеры жылых памяшканняў у буйных гарадах Беларусі і ў гарадах той самай Швецыі — гэта дзве вялікія розніцы. Вядома, не на нашу карысць. Таму нават фізічна весці сартаванне смецця дома далёка не заўсёды зручна. Не будзем забывацца і пра тое, што кантэйнерны збор смецця арганізаваны сёння нават далёка не ва ўсіх гарадах краіны, не кажучы ўжо пра сельскія населеныя пункты. Па-другое, навукова-абгрунтаваны выбар месцаў для стварэння палігонаў дазволіць кардынальна змяніць іх спецыялізацыю. Замест дробнага сартавання смецця і засыпання зямлёй яго рэшткаў можна будзе масава перайсці на спальванне з мэтай атрымання энергіі. Упэўнены, што тэхнічныя магчымасці Беларусі дазваляюць арганізаваць вытворчасць такіх энергаўстановак рознай магутнасці, якая будзе непасрэдна залежаць ад аб'ёмаў утвараемых адходаў. Па-трэцяе, вялікая колькасць існуючых палігонаў ужо перасягнула сваю праектную магутнасць і можа разглядацца як міна запаволенага дзеяння ў дачыненні да навакольнага прыроднага асяроддзя (значная частка іх не абсталявана патрэбнымі фільтрамі). Пры стварэнні новых палігонаў, калі асноўная частка смецця будзе спальвацца, маштабы такіх прыродаахоўных мерапрыемстваў будуць зменшаны, а значыць, адбудзецца эканомія дзяржаўных сродкаў.

Самае складанае пры выбары месцаў для стварэння палігонаў — аптымальная даступнасць да іх крыніц адходаў. Транспартныя выдаткі па дастаўцы смецця на палігоны будуць вызначальным фактарам пры іх тэрытарыяльнай арганізацыі. Тут можна казаць пра два падыходы такой арганізацыі. Першы — ісці шляхам стварэння меншай колькасці палігонаў, але вялікай іх магутнасці. У гэтым выпадку транспартныя выдаткі па дастаўцы смецця будуць большыя. Другі — ствараць вялікую колькасць палігонаў з меншай колькасцю смецця, у сувязі з чым выдаткі па транспарціроўцы смецця будуць змяншацца.

> «Колькі б каляровых кантэйнераў для раздзельнага збору смецця не ставілі камунальныя службы, змяніць свядомасць людзей вельмі складана».

Перакананы, што дакладныя разлікі па выбары аптымальных варыянтаў пляцовак для палігонаў — справа навукоўцаў і спецыялістаў навукова-даследчых устаноў. Самае галоўнае — не забывацца аб тым, што выбар месца для любога аб'екта — гэта абавязковы ўлік разнастайных фактараў: прыродна-экалагічных, сацыяльна-эканамічных, дэмаграфічных і нават геапалітычных.

У вырашэнні праблемы адходаў павінны знайсці месца і іншыя кірункі. Як вядома, матывацыя заўсёды была і будзе важным сродкам любой справы. Аднак калі паглядзець на сучасныя цэны на другасныя рэсурсы, якія збірае і здае насельніцтва на нарыхтоўчыя пункты, ахоплівае не проста здзіўленне, а жах. Тут не трэба быць матэматыкам, каб зразумець, што вытворчасць той самай паперы з драўніны абыходзіцца ў сотні разоў даражэй, чым з макулатуры. І што не менш дзіўна, макулатуру Беларусь вымушана імпартаваць і губляць ужо дадаводзіцца валютныя сродкі.

Глыбока перакананы ў тым, што наспеў час паступова адмаўляцца ад шэрагу тавараў, якія нясуць небяспеку навакольнаму асяроддзю. Маё пакаленне яшчэ памятае, калі асноўнай тарай для малака былі шкляны посуд і папяровыя пакеты. А што мы назіраем сёння? Вытворцы дадумаліся разліваць у ПЭТ-бутэлькі нават небезалкагольнае піва. Што ўжо казаць пра некаторыя віды вадкіх лекаў. Час ужо пераходзіць ад слоў да справы. Тым больш сёння ўжо ёсць станоўчыя прыклады, калі шэраг краін (нават у Афрыцы) поўнасцю забаранілі ўжыванне пластыкавых пакетаў, посуду і іншых небяспечных тавараў. Тут сапраўды «прамаруджанне смерці падобнае». Не хацелася б, каб у XXI стагоддзі палігоны цвёрдых камунальных адходаў сталі ў адзін рад з ваеннымі палігонамі і стралялі ў будучыню.

**Вячаслаў САСНОЎСКІ,**
**кандыдат геаграфічных навук, дацэнт.**

ІНТЭРАКТЫЎ

## ЖАДАННЕ ЁСЦЬ, А ІНФРАСТРУКТУРА?

### Падводзім вынікі апытанкі

Наша другая апытанка, прысвечаная тэме асобнага збору смецця, паказала высокую экалагічную свядомасць яе ўдзельнікаў. Прыхільнікаў гэтага пункту гледжання аказалася ажно 93.4 %! Цікава, што галасы тых, хто сартуе смецце дома, і тых, хто гэтым не займаецца, але хацеў бы пачаць, раздзяліліся пароўну.

А вось інфраструктура за жаданнем апытаных, на жаль, не паспявае. Толькі ў паловы тых, хто прагаласаваў, сметнічы для раздзельнага збору адходаў маюцца непасрэдна ў дварах іх жылых дамоў. Крыху меней — 45 % — зазначылі, што побач з іх пад'ездамі ўсталяваны толькі агульныя кантэйнеры. Рэшта выказалася за незвычайны на першы погляд пункт – вынас смецця ў суседнія двары, дзе можна асобна пазбавіцца ад шкла, металу, пластыку і паперы.

Таксама выявілася яшчэ адна цікавая рэч. Амаль тры чвэрці апытаных не ведаюць, дзе ў іх раёне можна здаць другасную сыравіну і атрымаць за гэта грошы. Яно і зразумела — капітальных будынкаў, дзе б дзесяцігоддзямі збіралі тую ж макулатуру, нават адразу і не прыгадаеш, а шыльды, якія інфармавалі б пра тое, што можна здаць паперу і бутэлькі ў нейкім вагончыку, амаль не сустракаюцца. Вось і знаходзяцца гэтыя кропкі збольшага выпадкова. Таму адзіны варыянт у такой сітуацыі — усё аднесці на сметнік.

Разам з тым 15 працэнтаў апытаных усё ж карыстаюцца пунктамі прыёму другаснай сыравіны. А ў дзясятай часткі рэспандэнтаў у населеным пункце іх няма ўвогуле.

Дзве траціны ўдзельнікаў нашай апытанкі жывуць у сталіцы або абласных гарадах. Пятая частка — у вёсцы, астатнія — у раённых цэнтрах. Палова ўсіх тых, хто прагаласаваў, знаходзіцца ва ўзросце ад 30 да 45 гадоў. Траціна куды старэйшая — ад 45 да 60. Рэшта адносіцца да моладзі.

### Наш інтэрактыўны праект з чытачамі працягваецца. Даведацца, наколькі мы «экасвядомыя», можна з новай апытанкі

***Якія віды адходаў вы сартуеце (гатовыя сартаваць) дома?***

☐ Паперу (кардон, газеты, часопісы, сшыткі, лісты, упаковачныя матэрыялы).

☐ Пластык: упакоўку, бутэлькі, пакеты, дзіцячыя цацкі, аднаразовы посуд.

☐ Метал.

☐ Шкло: бутэлькі, слоікі.

☐ Арганічныя адходы: харчовыя адходы, траву, лісце.

☐ Старыя рэчы: адзенне, абутак.

☐ Небяспечныя адходы: батарэйкі, ртутныя лямпы.

☐ Нічога.

***Ці карыстаецеся вы ўпаковачнымі матэрыяламі некалькі разоў?***

☐ Так, стараюся чыстыя пакеты выкарыстоўваць па некалькі разоў.

☐ Хаджу ў краму з торбай-шоперам.

☐ Кожны раз выкідваю пакеты.

***Куды вы выкідваеце выкарыстаныя батарэйкі?***

☐ Я карыстаюся акумулятарамі.

☐ У спецыяльныя кантэйнеры ў супермаркетах.

☐ Выкідваю ў сметніцу.

***У якім населеным пункце вы жывяце?***

☐ Мегаполіс (сталіца, абласныя гарады).

☐ Раённы горад.

☐ Пасёлак, аграгарадок, вёска.

***Узрост***

☐ 15—20 гадоў.

☐ 20—30 гадоў.

☐ 30—45 гадоў.

☐ 45—60 гадоў.

☐ 60+ гадоў.






# ПОМНІК КАЛЯ ДАРОГІ

## У Слаўгарадскім раёне дэпутаты разам з раённымі ўладамі стварылі мемарыяльны комплекс у памяць аб ахвярах Вялікай Айчыннай вайны

**ЁН з'явіўся на краі вёскі Рабавічы, дзе болей чым за два гады нямецкай акупацыі адбылося шмат трагічных падзей. Тут шчыльна перапляліся 1941-ы, калі раён быў акупаваны, і 1943-і, калі адбылося яго доўгачаканае вызваленне. Па некаторых звестках, на гэтым месцы толькі ў ліпені 41-га немцы расстралялі каля 200 мірных жыхароў і чырвонаармейцаў.**

У савецкі час тут насыпалі курган і ўсталявалі памятную пліту. Але з часам яна прыйшла ў непрыдатнасць і трэба было нешта мяняць. Ініцыятарам выступіў Лапаціцкі сельсавет. Працавалі над праектам усім раёнам: дэпутаты, супрацоўнікі выканкама, музейшчыкі, архітэктары і нават Ляснянскае лясніцтва. Ініцыятыву прадставілі на саісканне міжнароднай тэхнічнай дапамогі і атрымалі яе. Але аб'ект стваралі грунтоўны, таму прыйшлося ўкласці і шмат сваіх сродкаў. Істотна падтрымала добрую справу праўленне Магілёўскага абласнога аддзялення грамадскай арганізацыі «Беларускі фонд міру».

На невялікай па памеры пляцоўцы ўмясціліся драўляная вышка, калючы дрот, бліндаж, акоп, алея з памятнымі фотаздымкамі і хронікай падзей. Тут жа помнік ахвярам, якія загінулі ад нямецкіх акупантаў.

— Гэта месца знакавае, — кажа **старшыня Лапаціцкага сельсавета Сцяпан БАЙЦОЎ**. — Ёсць звесткі, што ў Рабавічах знаходзіўся часовы перасыльны лагер, праз які людзей адпраўлялі ў лагеры смерці. Пры вызваленні раёна Рабавічы некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. Непадалёку цячэ рака Проня, дзе ад крывавых баёў у 1943-м закіпала вада. Вайна — наша агульная бяда. Мой дзед таксама ваяваў, дадому вярнуўся без нагі. Але шмат хто не дачакаўся сваіх родных.


Сцяпан БАЙЦОЎ стаў адным з ініцыятараў стварэння мемарыяла.

— Я доўгі час жыў у Рабавічах і добра памятаю тое, што расказвалі старажылы, — успамінае **намеснік кіраўніка пошукавага атрада «Спадчына» Аляксандр ХАЛЕЯЎ**. — Пры вызваленні Прапойска (цяперашняга Слаўгарада. — **Аўт.**) найбольш моцныя баі праходзілі ў раёне вёсак Улукі, Рабавічы, Чырвоная Слабада, Завадзь Віравая, каля вёскі Рудня. Вораг упарта супраціўляўся, 26 кастрычніка 1943 года ў раёне Рабавіч ён правёў некалькі жорсткіх контратак супраць 120-й дывізіі. Пры адбіцці адной з іх наводчык 45-міліметровай гарматы гвардыі радавы Пётр Панамароў, які адзіны заставаўся яшчэ ў жывых, падбіў некалькі варожых танкаў і знішчыў каля 40 немцаў. За свой подзвіг ён быў пасмяротна ўганараваны званнем Героя Савецкага Саюза. І такіх прыкладаў было шмат. Таму хацелася б, каб на створаны мемарыяльны комплекс ішлі людзі.

Цяпер у Слаўгарадскім райвыканкаме ствараюць ваенна-гістарычны маршрут «Мінулых гадоў жывая памяць», які аб'яднае ўсе знакавыя мясціны, звязаныя з гадамі ліхалецця. **Намеснік старшыні Слаўгарадскага райвыканкама Алена ШАЎЦОВА** лічыць, што мемарыяльны комплекс у Рабавічах будзе цікавы для турыстаў. Дарэчы, на тэрыторыі Лапаціцкага сельсавета знаходзіцца яшчэ адзін аб'ект, звязаны з вайной, — лістоўніца, на якой быў нямецкі пункт назірання. Наглядальнікі ўзбіраліся на яго па металічных падковах, што былі прыбітыя да дрэва. Цяпер у гэтым месцы глухой сцяной стаіць лес, але падчас вайны з яго добра праглядалася Проня.

— Колькі б часу ні прайшло з той вайны, нельга забыць подзвіг савецкага народа, — кажа **старшыня Слаўгарадскага раённага Савета Святлана ЯЗЕРСКАЯ**. — Адгалоскі тых жахлівых часоў мы чуем дагэтуль. Падчас нядаўняга святкавання з нагоды вызвалення Слаўгарада адбылося перапахаванне астанкаў трох салдат, знойдзеных на тэрыторыі раёна. А колькі іх безыменных яшчэ ляжыць у нашай зямлі? Сімвалічна, што гэты мемарыял з'явіўся ў Год малой радзімы, ён як даніна памяці тым, хто не скарыўся ворагу, застаўся верны сваёй зямлі. Цяпер амаль не засталося ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і з дапамогай вось такіх комплексаў мы будзем расказваць моладзі гісторыю краіны. Вайна пакінула жахлівыя раны на нашай зямлі і хацелася б, каб нашчадкі пра гэта не забываліся.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**









МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 6 снежня 2018 года.**